Новы Час | 20 ліпеня 2018 | № 27 (590) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №7

Літаратурная Беларусь

Выпуск №7 (143)
(ліпень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by



Змест

Палеміка. Этыка прафесійная і «тусовачная»

Першыя этычныя кодэксы ў свеце з'явіліся як сродак барацьбы журналістаў з уласнай уседазволенасцю.



Упацверджанне гэтага тэзіса, не для ўсіх вядомага (а для многіх з тых, каму ён вядомы — не відавочнага), дастаткова прывесці ў прыклад гісторыю ўзнікнення шведскага этычнага кодэкса — аднаго з першых у свеце.

Першы закон аб свабодзе слова ў свеце быў прыняты менавіта шведамі ў 1766 годзе. Закон атрымаўся вельмі дэмакратычны і прыняты быў не без супраціву пэўнай часткі грамадскасці.

Пакінем у баку пытанне: што такое «занадта» ў дачыненні да дэмакратыі? Але, як адзначае інтэрнэт-выданне The Local, закон аб свабодзе слова (у арыгінале — «Яго Каралеўскага Вялікасці Міласэрны Указ Адносна Свабоды пісьменніцтва і Свабоды Слова») па гэты дзень застаецца адным з чатырох законаў, якія вызначаюць асноўныя палажэнні шведскай Канстытуцыі. Якая гарантуе, апроч іншага, права любога чалавека атрымаць доступ да афіцыйных дакументаў, не раскрываючы свайго імя і адрасу, а таксама не тлумачачы прычынаў, паводле якіх яму доступ спатрэбіўся. У чым аўтар і пераканаўся на прыкладзе горада Кальмар, калі ў складзе групы беларускіх журналістаў у мясцовым магістраце папрасіў інфармацыю па складзе насельніцтва горада. І адразу атрымаў яе. І нават не давялося адказваць на пытанне, каму і навошта гэта патрэбна.

Але немалая частка шведскага грамадства пачала выказваць незадаволенасць занадта вялікай свабодай для журналістаў. І тады ў краіне была створана Рада прэсы, якая і прыняла адзін з першых у свеце кодэкс прафесійнай этыкі. Асноўны, практычна, матыў: каб пазбегнуць прыняцця новага, больш строгага закона, лепш самастойна абмежаваць свае магчымасці.

З таго часу і пачалося: кодэксы ў значнай ступені былі больш жорсткімі за законы аб СМІ. Гэта значыць, працэс самарэгулявання СМІ, які сёння прыняў глабальны характар і які будуецца на аснове этычных кодэксаў, азначае самаабмежаванне. А інакш навошта б яны — этычныя кодэксы — былі патрэбныя?

Зрэшты, прынцып самаабмежавання рэгулярна ставіцца пад сумнеў. Што цалкам натуральна: а каму хочацца абмяжоўваць сябе?

Многія не разумеюць: як гэта — не красці, калі можна бязбоязна ўзяць, дапусцім, чужы кантэнт, змяняючы загалоўкі...

Што, незаконна? Што, іншым непрыемна? А гэта іх праблемы!

І тады пачынаецца... З'яўляюцца бяскрыўдныя, на першы погляд, ідэі, частка якіх прагучала (і была з задавальненнем успрынята!) на мінулым з'ездзе ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (БАЖ). А давайце ж мы нашыя прафесійныя этычныя стандарты зробім больш кампактнымі. Давайце іх пазбавім ад агульных тэм, ад агульнавядомых ісцін...

Але што можа быць больш агульнавядомым, немудрагелістым і больш «агульным», чым этычныя стандарты і прынцыпы? Ну, да прыкладу, закладзены ў Запаветы Майсея прынцып «не забі»... Забіваць кепска — ці ёсць на планеце чалавек, якому гэта не вядома? Чаму б і не выкрасліць гэты прынцып з запаветаў — як, зрэшты, і самі Запаветы? Яны ж складаюцца выключна з агульнавядомых і немудрагелістых прынцыпаў. Якія, да прыкладу, заклікаюць «...паважаць бацьку твайго і маці тваю...», што зусім ужо агульнавядома...

І калі прыбраць гэтае «агульнавядомае», тады ўсё стане прасцей, і многія з палёгкай уздыхнуць. Але і наступствы «кампактызацыі» нескладана прадбачыць. Бо тое, што не забаронена, дазволена. Ці не так? І тое, што сёння з'яўляецца выключэннем, заўтра можа стаць правілам?

У нашым прафесійным выпадку ўсё часцей гучаць заклікі прыбраць з Кодэкса, напрыклад, прынцып: інфармацыя павінна быць атрымана законным і этычным спосабам.

На апошніх перад нядаўнім з'ездам БАЖ пасяджэннях Камісіі па этыцы гэтая ідэя асобнымі яе членамі настойліва прасоўвалася. Як і шэраг іншых ідэй такога ж кшталту. Асноўны матыў: у нас такая краіна, у нас такая ўлада, што толькі законнымі і этычнымі метадамі нічога не даможашся, і мы павінны мець іншыя магчымасці...

Узнікае пытанне: якія? Незаконныя? Неэтычныя?

На такія пытанні прыхільнікі ідэі адмаўлення ад законнасці і этычнасці ў прафесійнай дзейнасці (а ліквідацыя ў Кодэксе вышэйназваных і іншых аналагічных прынцыпаў і стандартаў менавіта гэта і азначае...) адказу не даюць ці патэтычна дэкларуюць нешта няўцямнае. Накшталт таго, што... так, вядома, прынцыпы законнасці і этычнасці атрымання інфармацыі ёсць у большасці еўрапейскіх кодэксаў. Але мы і так будзем прытрымлівацца этычных прынцыпаў і стандартаў... Не трэба толькі іх прапісваць у нашых кодэксах, таму што, зноў жа, улада не дае магчымасці працаваць правільна... І краіна не такая... І чыноўнікі...

Як усё ж цікава! Сярод так званых «дзяржаўных журналістаў», з якімі некалі вучыліся ў адным універсітэце на адным і тым жа журфаку, мноства годных людзей і класных прафесіяналаў. Але калі прыходзіць гадзіна «ікс» і калі даводзіцца таўраваць апанентаў дзеючага прэзідэнта, не клапоцячыся пра законнасць і, зноў жа, этычнасць... з іх вуснаў гучаць дакладна тыя ж аргументы: улада дыктуе і не дае магчымасць працаваць правільна... І краіна... І чыноўнікі...

А ў выніку? Калі этычныя прынцыпы і стандарты не выконваюцца ў імя дэмакратыі, то пагроза не становіцца меншай, чым калі яны не выконваюцца ў імя дыктатуры: скажам мы, перафразуючы выдатнага чалавека Эрыха Фрома. І, насамрэч, тады і пачынаецца «свабода». Свабода падглядаць і падслухоўваць, красці кантэнт, называць апанентаў якімі заўгодна словамі. Ад абразлівага «гаўнюк» у дачыненні да палітычных актывістаў да абвінавачванняў калегаў у немагчымасці справіцца з фізіялагічнымі адпраўленнямі арганізма...

Вядома, дзеля такой «свабоды» трэба абавязкова зрабіць існуючы этычны Кодэкс БАЖ больш «кампактным» і больш «свабодным» ад асноватворных прынцыпаў і стандартаў прафесійнай этыкі.

Мне асабіста падаецца, што гэты шлях тупіковы. Я ўжо не кажу пра тое, што пераважная большасць з тых стандартаў, якія прапануецца прыбраць з Кодэкса БАЖ, а таксама тых, якія ад імя Камісіі па этыцы прапаноўваліся ў якасці дапаўненняў і якія на з'ездзе БАЖ былі названыя «дурнымі і шкоднымі»... Яны, да ведама, у тых ці іншых фармулёўках прысутнічаюць у еўрапейскіх этычных кодэксах. І выконваць іх нашым еўрапейскім калегам таксама не заўсёды проста. Напэўна, не ў такой ступені як нам, але ўсё ж... І пры гэтым ніхто ад этычнасці і законнасці не адмаўляецца.

І калі мы сапраўды арыентуемся на еўрапейскія каштоўнасці, то пажадана б ісці па кірунку да іх, а не ад іх...

Шчыра кажучы, я не ведаю ў сусветнай журналісцкай практыцы апошніх гадоў выпадку, калі б журналісцкая супольнасць абмяркоўвала магчымасць адмовы толькі ад этычнасці і законнасці...

Але калі ісці далей па гэтым шляху, мы абавязкова прыйдзем да фантасмагарычнай сітуацыі паводле Франца Кафкі: павольнага, але няўхільнага і непрыкметнага ператварэння існуючага сёння этычнага Кодэкса БАЖ у нешта кшталту крымінальных «паняццяў». Дакумента, зручнага ва ўсіх адносінах для той тусоўкі, у якую рызыкуе ператварыцца супольнасць, што ідзе па гэтым шляху...

Гэта маё асабістае меркаванне.

Анатоль Гуляеў, naviny.by

З кананічным Кананам

Кано́н

Пачну, па звычцы, троху здаля. Калісьці на «отделе» у Інстытуце сусветнай літаратуры (ИМЛИ) абмяркоўвалі мой разгорнуты артыкул для калектыўнага зборніка («братской могилы»).

Тэма нават па тым нібы дэмакратычным часе з гледзішча дэпартамента «мировой литературы» мала каго, апроч аўтара, вабіла, калі не насцярожвала. Праглядаю нататкі з таго ледзь не «бурапеністага» абмеркавання чвэрцьвекавое даўніны. Вось пярэчанні рашучага выступоўцы-апанента («шолахаведа»...): «Что ещё за национальное возрождение в XIX-XX веке? Он ссылается на какого-то Коно́на (націск на прадапошнім складзе), следом ксендза (Адама Станкевіча) пристегивает. Какое это отношение имеет к литературоведению? Пусть читает Буркхардта — там о Возрождении все сказано».


Тую «манаграфічную» тэму пра нацыянальна-культурнае адраджэнне давялося адрачыць на пэвен час, давяршыўшы яе, з большага, ужо па развітанні са згаданай установай («От Скорины до Купалы. Белорусская литература в контексте национально-культурного возрождения». — Москва, ИМЛИ РАН, 2006).

Спомнены ж вышэй апанент — дзякуй яму — міжвольна падштурхнуў да ўсведамлення істотнейшай — кананічнае — якасьці нашага, з Навагрúдчыны, беларускага творцы.

Узвышэнец

Недзе на сыходзе 1990-х кінарэжысёр, паэт Уладзімір Мароз ладзіў аб ім дакументальны фільм. Сцэнарам прадугледжаны быў і маскоўскі акрэц творчага абсягу гэтай Постаці. Выпала і мне на запрашэнне фільмоўца з прыступак бібліятэкі-«Ленінкі», дзе неаднойчы засяроджваўся над фаліянтамі наш чытач з Беларусі, сказаць колькі слоў перад камерай. Вось тыя словы з фільма:

«...Ведаеце, гэтае імя, мілагучнае, поўнае сэнсу таёмнага — Конан, здавён мяне прываблівала, яшчэ да асабістага знаёмства з Уладзімірам Міхайлавічам. Кон, лёс, наканаванне, прадвызначэнне, калі хочаце. Штосьці ёсць у гэтай сімвалічнай збежнасці прозвішча і жыццёвага пакліканя чалавека. Яго тэксты, на маё ўспрыманне, ёсць глыбокае асэнсаванне, адначасна й тварэнне беларускай культуры, нашага духоўнага космасу. Аб чым бы ні гаварыў, ні пісаў — пра сусветнае дрэва культуры, лірыку Багдановіча, ці разважаў над зямнымі і боскімі сэнсамі Скарынавага слова, — скрозь адчуваецца стрыжань, карнявішча нацыянальнага дрэва беларускага, глыбока ўрослага ў родную глебу, разгорнутага шатамі ва ўніверсальную прастору, у нябесныя высі. Сваімі працамі ён засведчыў высокае спалучэнне, узаемапрацяканне ў чалавечым лёсе, адпаведна ў культуры, зямных турбот і нябеснага парывання, неадольную тугу па неспатольнай гармоніі — вызначальнай дамінанты жыцця і быцця, акрэслішы, на беларускі лад, сваё эстэтычна-філасофскае крэда. Чалавек нараджаецца з каранёў і ўзыходзіць да красы нябеснай...»



Праглядаю «Погляд у вечнасць» — прысвячэнні на яго 75-я ўгодкі. Гожае на вокладцы аблічча юбіляра, скіраваны ўдалеч працінальны погляд. Абок яго ўзвышэнскіх тэкстаў («На ўзвышшах») калегі-сумоўнікі адарылі «сапраўднага беларускага філосафа» і падзячнымі высновамі пра «феномен Конана» (М. Крукоўскі), «носьбіта святла» (А. Разанаў), «вялікага Конана» (Н. Гілевіч). Да гэтых важкіх азначэнняў напрошваецца ранейшае слова Мікалая Улашчыка ў лісце ад 15.06.1986 г. (водгук на дасланую ў Маскву кнігу «Проблемы искусства Белоруссии в общественной мысли начала XX века»): «Мне яна спадабалася перш за ўсё тым, што манаграфія паказвае культуру аўтара і яго добрасумленнасць...»

Перада мной на рабочым стале мала не ўсе яго кнігадрукі — ад «Развіцця эстэтычнай думкі ў Беларусі...» (1968) да апошняе — «Выбранае» (2009), надпісанага аўтарам золкім кастрычніцкім надвячоркам у яго пакойчыку хмарачоснага паверха ў Серабранцы (вуліца Малініна): «Дарагому Аляксею Каўку з удзячнасцю за тваю працу для Беларусі. 18.10.2009». Абок — ніштаваты жэўжык яго публікацый з многіх беларускіх, часткова расійскіх, польскіх перыёдыкаў. Сваім часам прачытваў, цяпер перачытваю гэтае багацце роднага маўлення і мыслення. На грунтоўны выклад духоўна-эстэтычнай планіды Уладзіміра Конана мне ўжо не стаць (пэўнай кампенсацыяй маёй немачы, мяркую, паслужыць ксёнжачка Анатоля Астапенкі «Уладзімір Конан» у серыі «100 выдатных дзеячоў беларускай культуры» (2017), — прыстойныя ўводзіны у конаназнаўства, адмысловы раздзел у беларускай гуманістыцы абок скарына-купала-коласа-ўлашчыка і г.д. знаўства). Адважуся хаця б адцеміць два істотнейшыя напрамкі ў спадчыне нашага Думанніка:

— Адраджэнне — гістарычная праўдловасць, магістральны шлях нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі, яе нацыянальнай ідэі, нацыянальнага фундаменталізма, — ад Скарыны да Каліноўскага, Багушэвіча, Купалы да сучаснай постсавецкай эпохі.

— Узвышэнства — неадольны мастацка-літаратурны, культуровы рух «з нізін на ўзвышшы», да найвышэйшых праяў нацыянальнай і ўніверсальнай культуры. Сюды, да ўзвышэнскага клопату далучаем яго ж, Конана, незвычайную сутнасць у перадоленні «саўкова»-партыйных напластаванняў у нацыянальнай культуры, вяртанне ў яе арганіку спрадвечна хрысціянскага ўсведамлення ролі Праваслаўнай, Каталіцкай царкваў у жыццятворчасці Беларусі (напрыклад, артыкулы «Хрысціянства і беларуская культура», «Эсхаталагічныя матывы паэзіі Якуба Коласа», іншыя.) У гэтым шырэйшым кантэксце і асоба самога Уладзіміра Конана ўяўляецца мне жывым увасабленнем творцы-Узвышэнца.

Тэарэтык, герменеўтык мастацкіх набыткаў — ад незлічоных вуснапаэтычных скарбаў да прафесійнае класікі — празарлівы літаратурны крытык, ён нярэз падзіўляў чытача вычуленнем на праявы несамавітага мастацкага характва. Як, прыкладам, у выпадку з вершам «Вы шуміце, шуміце Нада мною бярозы...» Там, дзе спрактыкаваны аналітык паэзіі апроч знешніх «пацягушанак» чагось вартаснага не заўважыў, У. Конан адсланіў высока трапяткую касмічную лучнасць паэта з роднай зямлёй, класічную прастату яго лірычнага перажывання. Невыпадкова верш-песню (кампазітар Э. Ханок) падхапіў народ на хрэсьбінах, вяселлях (асабіста слухаў, падпяваў узрушаны ў ваколіцах майго Ігуменя-Чэрвеня).

На супольнай сцежцы

Пазнаёміўся з ім раней непасрэднай сустрэчы. Вясной 1979-га, праступочы цягніком з Масквы да Варшавы, сярод «дыпламатычных» ванзэлкаў тулілася тэчка з «беларускім» мінімумам: зборнічкі Купалы, Коласа, Багдановіча, нават крамольнага тады Гаруна (1920), манаграфіі Александровіча, Кісялёва, Мальдзіса і «Адам Бабарэка» Конана. Яго ўзвышэнскія росшукі-роздумы вабілі, дзесьці інтрыгавалі нечаканымі намёкамі на таёмную зорку літаратурнага небасхіла Беларусі...

Згледзеў жа «вживую» аўтара-ўзвышэнца ў менскім Доме літаратара на «круглым стале», прысвечаным 100-м угодкам Купалы, Коласа (Міжнародная канферэнцыя ЮНЕСКА «Славянскія культуры і сусветны культурны працэс» (1982), куды собіла было трапіць і мне, радзецкаму дыпламату з Варшавы). Менавіта Конан навукова «легалізаваў» тады перад беларускай і замежнай грамадскасцю купалавых «Тутэйшых». Тады ж мы і «парукаліся», адчуўшы ўзаемна духоўную блізкасць. Аб чым, дарэчы, сведчыла й маё спавешчанне на тым «стале» — «Ад тутэйшасці да нацыянальнасці». Назаўтра, пад знаёмства-развітанне, даверыў яму адбітак эміграцкага выдання М. Бярдзяева «Смысл истории».

Ці не скрозь сустракаліся на канферэнцыях, чытаннях, з'ездах згуртавання «Бацькаўшчына». Мінск—Горадня—Віцебск—Маладзечна—Полацак—Тураў — нашыя супольныя прыпынкі. Не мінулася і Масквы, уключна з маім колішнім Угловым завулкам — паміж Беларускім вакзалам і Бутырскай турмой. Цягам аднаго запозненага чаркавання на тым адрасе прытомлены Валодзя, эксперт беларускае дэлегацыі на перамовах у крамлёўскім «Нова-Огарёво», рэплікаваў з прытоенай усмешкай: колькі б, маўляў, палітыкі-верхаводы не радзілі, не спрачаліся, а незалежнасць дзяржаўная грукаецца ў нашыя дзверы, — такі ж адчыняцца. Што ўхуткасці і сталася.

Падчас першага З'езда беларусістаў ехалі разам на радзіму Якуба Коласа. У лесе блізу Альбуці аўтобус прыпыніўся, і купка делегатаў-экскурсантаў высыпала на ўзбочыну перадыхнуць водарам лясной цішы. Тады траіх нас (з В. Голубам, трэцім) і зафіксаваў нейчы фотааб'ектыў (Ул. Калеснікa, Т. Ткачэнкі?). Здымак той месціцца ў яго фоталетапісе ва ўспомненым «Выбраным».

Зноў жа фотка: Валодзя на лавачцы (сонечны травень 1997 года) перад тураўскай Усіхсвятскай царквой — пасярод Алены Яскевіч і Аляксея Каўкі — летуценна ўглядаецца ў храм.

Таго ж надвячорка грамадка наша «навуковая» ў таварыстве з Анатолем Вярцінскім, Аленай Яскевіч, Іванам Чаротам, іншымі ўдзельнікамі «праваслаўных чытанняў» пасля навуковых дыскусій адстаяла вячэрнюю службу ў храме. Потым з ласкі св.п. Кацярыны Паповай, мясцовай настаўніцы, паэткі, утрох (з А. Вярцінскім) падаліся на начлег у дамок былога старшыні колішняга перадавога калгаса А. Сяргейчыка. Прымалі нас гаспадар і гаспадыня дома пані Сяргейчыкава, доктар біялагічных навук, пільнавальніца кліматычнага рэжыму ў Батанічным садзе Мінска, ахарошвала тую сустрэчу над беражком Піны. Магчыма, уражанні з таго начавання «зашыліся» ў Валодзевых паперах.

Падзячны Уладзіміру Міхайлавічу за спрыянне рукапісу мае кнігі «Тут мой народ». Не менш — за ягоныя тэксты ў маскоўскім «Скарынічы», уключна з выпускам трэцім, з нагоды якога сябра «памасліў» укладальніку-«скарынічу» (слабы чалавек, што зробіш).

Захавалася колькі старонак з нашага ліставання (БДАМЛіМ, Фонд 740). У адным з лістоў Валодзя — пэўна, з падачы Мальдзіса — намаўляў калегу да вяртання на Радзіму, менавіта ў Скарынаўскі асяродак (прабачце, цэнтр). Не адбыліся тыя мройлівыя пярэбары. Шкада.

Увогуле ж калега-сябра мой, мысляр па натуры, не належыў да сухароў-нудотнікаў. Нярэз і мне, наезніку з Масквы, траплялася вітацца з ім на сходах, шэсцях нацыянальных у Менску, калі там ці не ўсё дэманстрацыйна нацыянальнае дратавалася паліцэйскімі дубінкамі і аўтазакамі. Конана Гасподзь сцярог ад тых «суверэнных» палак, але ж памятаю яго балючае перажыванне ў суверэннай краіне ад «суверэннага» зладзейства Вярхоўнага Хама, які, зглуміўшы нацыянальную святыню — Сцяг — прыпячатаў перад шырокім светам патрыятычных людзёў (наступнікаў нацыянал-дэмакратаў) «националистической сволочью» («Независимая газета», 1998, 5 февраля). Хаця, памятаецца, пры тых роспачлівых перажываннях Валодзя спрабаваў філасафічна, па-евангельску, суцешыць сябе і блізкіх: не варта адчайвацца, грэх; звар'яцелыя свінні рана-позна ў бездань зрынуцца.

Неўладкаваны сямейна, ён цалкам аддаўся адзінай сваёй абранніцы — Беларусі. Не забудзецца яго слова на адным з першых сходаў БНФ узімку 1988 года. Пасля ўступнай прамовы Васіля Быкава да трыбуны падыходзіць Конан. Мяккі прыцішаны голас і суцішная заля ў Чырвоным касцёле. Ён не прамаўляў, а толькі, нібы пра сябе, пераказваў думку Ул. Салаўёва адносна нацыянальнага пытання ў колішняй Расійскай імперыі (пераказваю з памяці пачутага і занатаванага): «Национальный вопрос для России — это вопрос её достойного существования. Для национальных окраин — вопрос ихнего выживания...» Уладзімір Конан, працытаваўшы меркаванне расійскага філосафа, адразу ж удакладніў — пад сціплыя воплескі слухачоў: варта дамагацца прыстойнага жыцця, не выжывання, нашае Бацькаўшчыны-Беларусі.


«Самотны рыцар гармоніі» — адгукаўся Уладзімір Конан з юбілейнай нагоды да старэйшага калегі і сябра Міколы Крукоўскага з філасофскай парадыгмай мудрасці і небезнадзейнага смутку: «Самотна сёння рыцарам гармоніі і класічнага квітнення культуры, і наступіў час татальнага цемрашальства — эпоха заняпаду, дэнацыяналізацыі... і нігілізму. Але ж даўно было запаведана людзям: «І святло ў цемры свеціць, і цемра не агарнула яго».

Будам імкнуцца да святла і светлых людзей.

Аляксей Каўка

11 ліпеня споўнілася б 50 гадоў беларускай пісьменніцы **Святлане Явар**. Яна нарадзілася ў Мінску ў сям'і пісьменніка Барыса Сачанкі. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1990) і аспірантуру Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН Беларусі (1993). Працавала ў Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Ф. Скарыны, Беларускім універсітэце культуры, часопісе «Крыніца», штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», Інстытуце мовазнаўства, Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі, Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Раптоўна памерла 8 чэрвеня 2011 года.

Аўтар паэтычных зборнікаў «Белы месяц» (1994), «Раніца ў туманах» (1994), апавяданняў, шматлікіх навуковых артыкулаў.



Святлана

Яна не дажыла да свайго пяцідзесяцігоддзя сем гадоў. І цяпер, разбіраючы папкі з яе рукапісамі (тэксты сапраўды рукапісныя ці набраныя на друкавальнай машынцы), разумееш, што яе жыццё абарвалася на ўзлёце. Дзякуючы дапамозе маладой паэткі Таццяны Барадулі, якая напісала пра Святлану Явар (Сачанка) і надрукавала ў «Літаратуры і мастацтве» вельмі шчымлівае эсэ, падрыхтаваны да друку новы зборнік паэзіі і прозы Святланы Явар «Дзівосны сад»...

У маленстве, юнацтве Святлана шмат малявала, займалася музыкай, іграла на фартэпіяна і гітары, цудоўна спявала. Унікальныя запісы прывезла з фальклорных экспедыцый... І потым гэта ўсё пачало пульсаваць у яе літаратурных творах, яе паэзіі... А каб уявіць, чым жыла Святлана ў апошнія свае гады, мы выразшылі змясціць некалькі ўрыўкаў з яе навуковых даследаванняў. У папках і скрынях — падрыхтаваны да друку пераклад з польскай мовы кнігі Казіміра Барташэвіча «Гісторыя паўстання Касцюшкі», навуковыя, публіцыстычныя артыкулы.

Рукапісы, якія чакаюць свайго чытача.

Галіна Багданава, сястра

З новай кнігі Святланы Явар «Дзівосны сад»

Дзяцінства

Збіралі ўночы з бацькам
светлякоў.
Пакорлівыя мяккія стварэнні
Паўзлі ў дзівакаватым
утрапенні,
Абкружаныя роем сябрукоў.

Святлом зеленаватым разганялі
Начную цемру, ды маглі згасаць:
Не зносілі, калі іх прымушалі,
Супроць жадання,
твары асвятляць.

Няволю, здзек жывое не прымала.
Прыгожае і гвалт не сумясціць.
Але дагэтуль успамін кранае —
Няўлоўнае хацелі мы славіць.

З памерлым бацькам
у паўднёвым садзе
Збіраем у хусцінку светлякоў,
Насуперак жыццёвай
простай праўдзе, —
Вакол прастор-міраж, краіна сноў.

З артыкула «Край мой васільковы»

Беларускія жанчыны заўсёды былі адданымі сяброўкамі сваіх мужчын, самаахвярна адстойваючы поплеч з імі высакародныя ідэалы, плённа працуючы дзеля росквіту Радзімы. Вядома многа імёнаў такіх жанчын — ад А. Пашкевіч (Цёткі) да Л. Геніюш, ад П. Бадуновай да З. Тусналобавай. Не выключэнне і кампазітар Э. Зубковіч (1895—1983).

Лёс не асабліва песціў Эльзу Робертаўну Зубковіч (у дзявоцтве Пілеман). Гадавалася яна ў сям'і лекара. Музыку сачыняць пачала з маленства. Так, яшчэ дзіцём напісала зборнік п'ес для фартэпіяна, які называўся «Дзіцячы музычны альбом». Жывучы ў Мінску, Эльза з поспехам — на выдатныя адзнакі — закончыла музычную школу (1914 г.). Дзяўчына марыла прысвяціць сябе кампазітарскай творчасці цалкам, дзеля чаго і рыхтавалася паступаць у Мінскую кансерваторыю. Аднак, на вялікі жаль, на шляху адоранага чалавека ўзніклі нечаканыя перашкоды. Са здзяйсненнем спадзяванняў Эльзе давялося пачакаць...

Пачалася першая сусветная вайна. Э. Пілеман стала сястрой міласэрнасці ў тым шпіталі, дзе яе бацька ў той час працаваў галоўным урачом. Адначасова яна працягвала атрымліваць музычную адукацыю: вучылася ігры на фартэпіяна ў прафесара Варшаўскай кансерваторыі (яго імя невядомае). Займалася творчасцю: пісала фартэпіянныя прэлюдыі. Грошы зараблялa, выступаючы як салістка на канцэртах камернай музыкі...

Мая даражэнькая

Так пяшчотна і ў той жа час па-таварыску звярталася да Зосі яе першы муж, які пакінуў яе дзеля маладзейшай жанчыны. Застаўшыся адна, Зося адчувала сябе незапатрабаванай і часам не знаходзіла сабе ніякага занятку. Ад суму яна пачала перабіраць паперы і выпадкова на антрэсолях знайшла напісаныя паўстагоддзя таму пісьмы яе закаханых бацькоў. У бацькавых лістах Зося са здзіўленнем знайшла той жа зварот да мамы: «Мая даражэнькая». А маміны пісьмы ўразілі Зосю настолькі, што яна ўявіла сябе сваёй маці і гэтак жа, як мама, паехала жыць і працаваць у вёску пад Глыбокім. Толькі Зося зрабіла гэта ў думках, а мама была там наяве.

Пасля мамінай смерці Зося наўмысна з'ездзіла ў Глыбокае, але менавіта да той вёскі так і не даехала. Зося хацела б лепей зразумець сваіх бацькоў, у прыватнасці, сваю маму, якую, на жаль, не заўсёды разумела пры жыцці. «Мая даражэнькая...» Якой была мама ў маладосці? Відаць, мужнай, смелай і бязмежна самотнай у сваім далёкім Глыбокім...

Быў 1959 год. Вясёлыя студэнцкія гады адплылі ў нябыт. У Мінску застаўся каханы і блізкі чалавек. Месцаў для настаўнікаў мовы і літаратуры ў сталіцы няма, у родным Крычаве — таксама. Трэба ехаць па размеркаванні. Сталічнае жыццё ўжо спадабалася: тэатры, музеі, канцэрты, выстаўкі... Будучыня выглядае змрочна — глухая правінцыя. Як сустрэнуць, як прывітаюць? Адно спадзяванне — на каханага, што ён застанецца, як і раней. Надзеяй і апорай.

Невялікая колькасць рэчаў, хуткія зборы ў дарогу. Вось і райцэнтр: больш чым стрыманы, хутчэй халодны, прыём мясцовых жыхароў-каталікоў. Абыходжанне як з чужой, засланай для барацьбы з забабонамі, у тым ліку і з рэлігіяй. Мама некалі напісала бацьку ў лісце жартам, што хацела б выйсці замуж за хутараніна і павянчацца з ім у касцёле. Праўда, спачатку трэба сабраць неабходны для гэтага пасаг: посуд, падушкі...

Аднак тут яна відавочна нейкая «не свая». Выкладае рускую (!) мову і літаратуру, вядзе занадта свабоднае жыццё, — гэта падумаць толькі: жыве, не «распісаўшыся», з мужчынам з Мінска, які прыязджае да яе ў госці! Занадта часта яны і сазвоньваюцца, перапісваюцца. Пісьмы з Мінска прыходзяць штодня. А яна ж, новая настаўніца, такая прыгожая, талковая. З яе тут, у вёсцы пад Глыбокім, маглі б чалавека зрабіць! І замуж тут бы яе аддалі — за Франца. Ён потым мясцовым дырэктарам школы быў. І не п'е, і не курыць, і не гуляе; больш таго — вышывае, вяжа, пячэ торты і ходзіць у касцёл! А сям'я ў яго якая прыстойная — палова радні ў Польшчы. Але ж новая «навучыцелька» ўжо ўпадабала таго чарнявага журналіста з Мінска. Да таго той, як кажуць, «абнахалеў», што нават на ўроках у яе сядзеў. А як вучні пыталіся, хто гэта, дык іх настаўніца адказвала: «Гэта... правяраючы».

Віруе правінцыйнае жыццё. У Глыбокім, ды і ў той вёсцы, ідзе «будаўніцтва сацыялізму». У адным з мясцовых касцёлаў размяшчаецца зернясховішча. Настаўнікі ездзяць па вёсках і праводзяць антырэлігійную прапаганду. Вясковае насельніцтва сустракае і іх, і іх прапаганду, мякка кажучы, непрыхільна. У многіх вучняў бацькі п'юць і скандаляць дома. Адзін вучань, як сапраўдны артыст, імітуе п'янага тату. Усе рагочуць. Новую маладую настаўніцу начальства імкнецца загрузіць працай напоўніцу. А мама рвецца ў Мінск, ёй патрэбен кожны выхадны, каб з'ездзіць туды, у сталіцу. Дзеля свайго каханага, у якога ўжо выйшла першая кніга, у якога ўжо ажаніліся лепшыя сябры. У любы момант любоўны раман можа закончыцца. І што тады? Выйсці за хутараніна і хадзіць у касцёл, хаця ты сама ў Бога не вельмі і верыш (бо выхавана ў сям'і настаўніцы)...

Неўзабаве пачынае раздражняць усё: складаныя ўмовы працы (часам трэба хадзіць вечарамі па некалькі кіламетраў праз лес, вялікая педнагрузка, у тым ліку ў вячэрняй школе), лад жыцця мясцовых настаўнікаў з гулянкамі і п'янкамі ў вольны час, вымушанасць выглядаць і трымацца, як адзінокая жанчына.

І тут маме ўзгадваецца Якуб Колас. Напэўна, яго турэмная лірыка. «Вобразы мілыя роднага краю...» У Мінск, у Мінск! Там сапраўдная віхура, у якой ствараецца гісторыя. У Мінску сабрана ўсё лепшае, вышэйшае. Ды нават газеты, часопісы новыя пачытаць — і то было б цікава. Тым больш, калі ў іх друкуецца твой каханы, пра адносіны з якім ты ўпарта нікому не расказваеш (усе і так даўно ўсё зразумелі).

Выкройваецца час, за апошнія грошы купляецца білет, і ты едзеш у Мінск, які, ты верыш у гэта, неўзабаве будзе тваім родным горадам. Гуляеш па сталічных вуліцах, дыхаеш задымленым паветрам, такім жа брудным, як у тваім родным Крычаве. Шумяць дрэвы на алеях паркаў, разам з табою гэты шум чуе твой каханы, які заўсёды побач душою і толькі зрэдку побач фізічна. Як жа цяжка даводзіцца табе без яго!

Надыходзіць 1960 год. Ужо звыклым зрабілася Глыбокае. Жыццё ўвайшло ў нейкую нармальную каляіну. Хочацца працаваць, настаўнічаць. А там, далей, — можа, і аспірантура? Навуковыя ж здольнасці былі. У вёсцы пачалі паважаць, начальства ўжо ставіцца больш прыхільна. Больш магчымасцей для кар'ернага росту, сяброўкі з роспытамі пра каханне больш не чапляюцца: усе да ўсяго прывыклі. І тут — раптоўная цяжарнасць! Так, цяпер будзе цяжэй. Па размеркаванні не дапрацуеш, на тваім месцы апынецца іншы чалавек. Ды і каханаму — дадатковыя клопаты. Добра, калі ён не адмовіцца ад свайго першага дзіцяці і ажэніцца. А калі не? Тады што рабіць?

Але каханне перамагло ўсё. Чакаюць нараджэння хлопчыка. Мама знаёміцца з бацькамі будучага мужа. Плануецца яе хуткі пераезд на радзіму маці, у Крычаў. Бывай, Глыбокае! (У мясцовых жыхароў вочы вылезлі на лоб ад здзіўлення: гэта ж трэба, новая настаўніца ўхітрылася зацяжарыць!) Але надзея вярнуцца застаецца.

Бацьку будучага дзіцяці забіраюць на вайсковыя зборы, маці жыве ў Крычаве і часта глядзіць па тэлевізары футбол, спадзеючыся, што народзіцца хлопчык. Але нараджаецца дзяўчынка. Зосіна старэйшая сястра...

Зося нарэшце адарвала позірк ад напаўзацёртых чарнільных літар на пажаўцелых пыльных старонак бацькоўскага рамана ў пісьмах. Усё ёй цяпер зрабілася зразумелым: што такое каханне, якой павінна быць жанчына, каб мець асабістае шчасце. Зося ў глыбокай задуменнасці ўстае з канапы, на якой яна чытала тыя пісьмы, і звязвае іх вяровачкай ізноў. Так, толькі жаноцкасць, толькі магутная жаноцкасць. Адсутнасць прамалінейнасці і грубасці, — у гэтым сакрэт жаночага поспеху і жаночай «кар'еры». Як навучыцца разумець мужчыну, яго патрэбы ды інтарэсы, навучыцца дапамагаць яму так, як гэта рабіла мама?

А тут думаеш пра сябе... Як спала, як ела, як адчуваеш сябе, у якім настроі ходзіш. Што надзець, куды схадзіць. Думаць жа трэба пра бліжняга, і тады ўсё атрымаецца, пойдзе на лад. Вось жа знаходзіўся ў мамы час, каб клапаціцца не толькі пра сябе. Вучняў і кар'еру, але і пра бацьку. Каб любіць каханага, аддаваць яму ўсю сябе. Марыць пра яго як пра будучую «зорку» літаратурнага Алімпа. Адкуль, адкуль бяруцца гэты неверагодны эгаізм у тых, хто зусім не збіраецца мець сям'ю? Як гэта можа быць, каб людзі былі ў інтымных адносінах і не адчувалі за гэта ніякай адказнасці ні адно перад адным, ні перад Богам? І як заставацца сябрамі, як мама з бацькам, цэлыя 25 гадоў?

Пытанні, пытанні, пытанні. На іх не дасі адказу розумам. Адказаць на іх можна толькі сэрцам. Чулым чалавечым сэрцам, здольным любіць і паважаць іншага чалавека. Нехта скажа, што гэта занадта проста. Але ж менавіта ад любові і ў любові нараджаюцца дзеці, ствараюцца мастацкія шэдэўры і здзяйсняюцца навуковыя адкрыцці. Усё астатняе — ад нячысціка. Так, лагічнае, разумнае ўражвае, але яно не дае плёну. Кветка доўга цвіце толькі ў атмасферы любові. Зненавідзьце кветку, разлюбіўшы яе, — і яна хутка завяне, загіне.

Вось у чым разгадка таямніцы вечнага жыцця, мая даражэнькая!

ГЭЙ БЭН ІНОМ

(Урывак з рамана)

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

«...і ніколі я не паміраў».
Янка Купала

«Пазбегчы гэтага немагчыма,
але можна грэбаваць усім гэтым».
Луцый Анэй Сэнэка

У кабінет Сталіна ўвайшоў Гітлер. Дзверы за правадыром і камісарам зачыніліся, потым зноў расчыніліся — і хутка, як ускочыў, увайшоў фюрэр. У лётным шлеме з чырвонай зоркай.

— Прыснулі? — спагадліва спытаў ён Купалу. І замахаў рукамі, убачыўшы, што ашаломлены Купала падымаецца. — Спіце, спіце!.. Не здзіўляйцеся, я толькі што з самалёта. Мы з Іосіфам час ад часу мяняемся. Я тут за яго... ён там за мяне...

Гітлер падскочыў бліжэй, і Купала ўбачыў, што ў яго розныя вочы. Адно зялёнае, якое міргала, а другое карычневае, якім ён глядзеў, не міргаючы.

— Тое, што мы робім, — угледзеўся ён у Купалу неміргаючым вокам, — тыя ідэі, праз якія хочам змяніць свет, па-рознаму называюцца, але падобныя. Як і спосабы, якімі дзейнічаем. Так што і я тут, і ён там, як дома. Не маем асаблівых праблем. Ну, хіба што з габрэямі... Ды спіце, спіце! Што вас так напружыла? Вы ж, наколькі мне вядома, не габрэй.

«Габрэй, не габрэй... Адкуль ён увогуле мяне ведае?» — падумаў Купала, ужо не спрабуючы зразумець, як гэта Гітлер, няхай і ў лётным шлеме з чырвонай зоркай, можа быць замест Сталіна, а Сталін замест Гітлера? Зразумець такое было немагчыма, а фюрэр спытаў:

— Чаму немагчыма?.. Магчыма, калі зазірнуць углыб. У адносіны германскай і расійскай імперый апошнімі... ну, прыкладна трыма стагоддзямі. А ведаю я вас праз Вільгельма. Праз майго даўняга партыйнага таварыша Вільгельма Кубэ, якога я паставіў генеральным камісарам у Беларутэніі. — І Гітлер міргнуў зялёным вокам. — Нічога, што я гэтак Беларусь называю?.. Вільгельм настойвае менавіта на такой назве. Ён у мяне вучоны. Яшчэ й паэт, драматург, як і вы. І як Мяркулаў, — раптам весела ўспомніў Гітлер. Абое рабое. Што ў Сталіна, што ў мяне. Сталінскі «драматург» на свайго начальніка, на Берыю данос напісаў, а мой — на майго намесніка. На Бормана. Прыдумаў, нібы ў таго цешча габрэйка. Калі высветлілася, што не, непрыемнасці былі ў Вільгельма. Судзілі за паклёп вышэйшым партыйным судом. Хоць, можа быць, дарма. Яшчэ нябожчык Гейдрых западозрыў, праз што ангельцы і забілі яго, што ў маім блізкім атачэнні з'явіўся сталінскі агент. Мянушку ён меў Вектар. Дык вось гэтым Вектарам, калі верыць амерыканцам, быў якраз Борман. Так што нездарма ўнюхаў Кубэ ў ім нешта не тое. І я адчуў, што нездарма, дапамог Вільгельму выслізнуць з-пад суда за паклёп з мінімальнымі стратамі. Як ён мне некалі, даўно, яшчэ ў тую вайну, дапамог выслізнуць з-пад суда за дэзертырства. — Гітлер весела хіхікнуў. — Я, між намі, калі на вайну ўзялі, спачатку ў сімулянты, а пасля ў дэзертыры падаўся. Надта не хацеў, каб мяне забілі. Дык Вільгельм доктара знайшоў, габрэя, які напісаў, што я не зусім нармальны. Маўляў, мастак. І паглядзіце, што малюе. У судзе паглядзелі і згадзіліся, што так... А я някепскім мастаком мог быць, калі хочаце ведаць. Ды ўжо адчуваў, як і вы, іншае прадвызначэнне... І калі Кубэ за паклёп судзілі, я сказаў: ён жа драматург! Ці мала якія ў драматурга могуць быць фантазіі! І саслаў яго ў правінцыю, далей ад рэйхсфюрэра Гімлера, які на яго зуб вастрыў. Пасля перавёў, хоць усе былі супраць, у Мінск. Ён, дарэчы, і пасля вайны хацеў у Мінску гаспадаром застацца. А каб гаспадарыць без лішніх праблем, яму патрэбная была лаяльнасць вашых, як вы іх назвалі, тутэйшых. Таму ён пачаў збліжацца з інтэлігенцыяй, з нацдэмамі. Пад Мінскам раскопкі правёў, шкілет нейкі выкапаў і ў Берлін прыпёр, каб даказаць, што беларусы не славяне. Арыйцы. І што ў адносінах да іх трэба праводзіць іншую палітыку, чым у адносінах да рускіх. Продкі беларусаў, маўляў, былі ў Еўропе — і нашчадкаў іх трэба вярнуць да Еўропы. Уключыць Беларутэнію ў склад Рэйху. Як аўтаномію. Даць ёй прыкметы дзяржаўнасці. Сцяг, герб... Во як усё магло павярнуцца. А вы: «Партызаны, партызаны, беларускія сыны, біце ворагаў паганых, каб не ўскрэслі век яны!..» Яно ўвогуле правільна, толькі не ў той бок напісана. Ці ў той?.. Вы хітры такі? — раптам зыркнуў фюрэр на Купалу карычневым вокам. І доўжыў, не дачакаўшыся адказу. — А Кубэ, каб давесці, што вы арыйцы, што ў нас з вамі адны карані, вось что пісаў... Пачакайце, дайце ўспомніць. Як там?.. «Мы з Рэйху, звязаныя ніткай адной З сівой даўнінай, што не стлела, Сатказь дапаможам вам белы сувой, Каб гэта краіна пад зоркай сваёй І хлеб свой, і радасць займела» — прачытаў па-беларуску нават лепш за Сталіна, без ніякага акцэнту Гітлер. І рукі пацёр задаволена. — Бачу, што здзівіліся. Я і сам здзівіўся, наколькі гнуткая мова. Яна і для вершаў, і для вайсковых загадаў. Як і нямецкая. Таму мне й падумалася, што, можа быць, Кубэ не такі ўжо фантаст. Перагаварыў пра гэта з Гімлерам, спытаў, што ён думае пра шкілет, пра вершы? Пра ўсё, што робіць Кубэ ў Беларутэніі... І ведаеце, што мой намеснік адказаў? Што Кубэ за гэта адразу можна было б расстраляць, але можна й пачакаць, пакуль яго за гэта кончаць рускія... Вось вы памерлі, дык вам наперад вядома: сапраўды яго рускія заб'юць? Ці нашы?..

Купала наперад ведаў, што скажа Гімлер, калі Кубэ скончыць жыццё на міне, падкладзенай пад ложак у ягонай спальні. «Якое шчасце для Айчыны!» — скажа рэйхсфюрэр Гімлер.

Гітлер спытаў пра Кубэ, але Купалу здалося, што ён і пра сябе хацеў нешта спытаць. Можа быць, ці не заб'юць яго рускія? Але не спытаў.

— Зрэшты, гэта не так важна, спіце... Каб вы толькі ведалі, як я сам спаць хачу! Заснуў бы мёртвым сном, здаецца. Але як заснеш, калі вайна? Калі за табой Айчына, нацыя... — прайшоў углыб кабінета і сеў на месца правадыра фюрэр. — За вамі, дарэчы, таксама. Не такая, вядома, як за мной, Айчына і не такая нацыя, але кожны мае тое, што мае. Што выбраў у іншых! — сціснуў у кулачок левую руку, якая была не большай за скалечаную руку Сталіна, Гітлер. — Ці што іншыя далі. У тую вайну вы нічога не займелі, і з гэтай вайны не вырвалі нічога, але Кубэ кажа, што пара вам нешта даць. Праблема толькі ў тым, што даваць няма каму. Ні нацыі нямашака, ні нацыянальных лідараў. Нікога, хто мог бы стаць сімвалам новай краіны... Вось я выканаў сваё прадвызначэнне, узвысіў Нямеччыну і немцаў, — раптам узняўся над сталом Сталіна Гітлер, — а вы сваё — не! Калі б не падаліся ў Маскву, а засталіся ў Мінску, маглі выканаць! Гэта не я прыдумаў, гэтак Кубэ напісаў мне тры дні таму. І яшчэ ён напісаў, што праз гэта вас і забілі. Спытаю сёння Іосіфа, ці так?..

Гітлер зноў прысеў, зірнуў на гадзіннік.

— Калі дачакаюся яго... Пэўна, да генералаў сваіх у штаб падаўся. Думаць будуць, як быць? Што рабіць? Мы Севастопаль сёння ўзялі. На чарзе Сталінград. У, як Іосіфу гэта не падабаецца! Ну, што мы збіраемся на Сталінград пайсці. Кажа мне: ідзіце на Варонеж. Дык я яму: не трэба было сваім іменем горад называць. Вось у мяне ж няма Гітлерграда. А Манштэйн, які Севастопаль сёння ўзяў, жартуе. Маўляў, няхай зноў назаве Сталінград Царыцыным. Тады можна будзе сказаць, што наўмысна горад здаў, каб пакончыць з царызмам. Дык Іосіф ускрыўдаваў. Гумару нямецкага не зразумеў. Хоць, калі па праўдзе, іншым разам ён не надта ўдала жартуе, Манштэйн. Мне можа нагадаць, што я яфрэйтар, а ён генерал. Іосіф такога генерала тут жа расстраляў бы, як Тухачэўскага, а я трываю. Бо хто мне гарады будзе браць?.. Я Манштэйну гэтаму, — скрушна ўздыхнуў фюрэр, — сёння званне фельдмаршала прысвоіў. Цяпер будзе казаць, што я яфрэйтар, а ён фельдмаршал...

Ён зноў на гадзіннік зірнуў:

— Можа, мне генералісімусам стаць? Гебельс вушы прасвідраваў: станьце, станьце... І вам, дарэчы, калі б у Мінску засталіся, я мог званне прысвоіць. Не фельдмаршала, вядома. А, напрыклад, ганаровага сябра Імперскай палаты літаратуры. Ці народнага паэта Рэйху. Або лаўрэата Гітлераўскай прэміі. Зрэшты, можна і тое, і другое. Прэміі Гітлера, праўда, пакуль няма, ёсць прэмія Гётэ, але чаму б не заснаваць?.. Ці вам не падабаецца ідэя? — трохі ўзнерваваўся фюрэр. — Па твары бачу. Чаму?.. Лаўрэатам Сталінскай прэміі можна быць, а лаўрэатам Гітлераўскай прэміі — не? А якая розніца, калі я там — тое самае, што ён тут? І я там, да вашага ведама, столькі літаратараў, колькі ён тут, не знішчыў. Паэтаў нямецкіх сотнямі не страляў, як ён савецкіх. Ці я проста сам па сабе вам не падабаюся?..

Гітлер, уважліва паглядзеўшы на Купалу, мусібыць, вырашыў, што так, не падабаецца ён яму, і ўскрыўдаваў.

— А Кнуту Гамсуну падабаўся! І Герхарту Гаўптману, які на ўсе спектаклі па сваіх п'есах мяне запрашаў. Гаўптман, дарэчы, не нейкай там Сталінскай прэміі лаўрэат. Нобелеўскай. Як і Кнут Гамсун, пра якога ваш Горкі сказаў, што ягоныя творы — святое пісанне. І што мы ў тым пісанні чытаем?..

Фюрэр дастаў з адной кішэні фрэнча ключ, з другой фотаздымак, на які паглядзеў і паклаў на стол: «Пачакайце, надпішу, а то забудуся...» — і самапіскай, якой Качарыга рэкамендаваў Купалу ў партыю, фота надпісаў, потым адмкнуў шуфлядку (Купалу не відаць было, якую: верхнюю, сярэднюю, ніжнюю?), узяў з яе нататнік.

— Гэта Іосіфа нататнік, ён запісаў тое, што Гамсун пра мяне сказаў. «Англія хацела вайны, і Гітлер агаліў меч. Ён, крыжаносец і рэфарматар, хацеў стварыць новую эпоху і новае жыццё для ўсіх народаў, усталяваць непарушнае міжнароднае адзінства дзеля росквіту кожнай краіны. І высілкі ягоныя не сталі марнымі, народы і нацыі падтрымалі яго, сталі поплеч з ім, каб разам змагацца і перамагчы!..» Далей пра тое, што я нявілікі з найвялікшых, але гэта не ўсё... Ведаеце, што, сказаўшы так, яшчэ зрабіў Гамсун? Аддаў свой нобелеўскі медаль майму «святапісцу» Гебельсу! Той жа таксама пнецца ў пісьменнікі... усе чамусьці ў пісьменнікі пнуцца... дык ачмурэў ад шчасця, падумаўшы, што гэтак мэтр ацаніў ягоную пісаніну. Спытаў: «Чым я магу аддзячыць вам за такі гонар?» І пачуў: «Сустрэчай з Адольфам Гітлерам».

Паклаўшы на месца нататнік, Гітлер замкнуў шуфлядку, выйшаў з-за стала.

— Гебельс угаварыў мяне з Гамсунам спаткацца. Праз тое гвалт ва ўсім свеце ўсчаўся. Англасаксы, амерыканцы, французы, самі нарвежцы калабарантам яго, здраднікам назвалі. «Як можна, — крычалі, — паціскаць руку, якая ў крыві!..» А ведаеце, дзеля чаго ён так хацеў пабачыцца са мной, разумеючы, як яго за гэта будуць ганьбіць, зневажаць? Што прасіў пры сустрэчы? Бачу, што ведаеце... Дык вось паставіць сябе дзеля Айчыны на скрыжаванне ганьбы і знявагі — гэта нават не грудзьмі на кулямёт кінуцца. Там імгненне, іскра, а тут... Тут насамрэч вялікі подзвіг. Самаахвярнасць, а не здрада. Шкада, што вы пра гэта не падумалі, перш чым ад нас з Мінска ў Маскву ўцякаць.

— Адольф Алаісавіч, ваш самалёт запраўлены, гатовы да вылету, — адчыніў дзверы ў кабінет Сталіна ягоны сакратар, пра якога Купала раптам успомніў, што Сталін жонку ягоную расстраляў, і, мусібыць, сакратар адпомсціць Сталіну хоча, таму Гітлера ў кабінет пускае і ключы яму ад сталінскага стала дае, дзе самыя сакрэтныя паперы ляжаць, а Гітлер сказаў, выходзячы ў дзверы, у якія ўваходзіў Сталін: «Зусім не таму... І зусім не пра тое вам, Іван Дамінікавіч, думаць трэба. Пра місію Гамсуна думайце, пра тое, што ён прасіў...» — і яны, Гітлер са Сталіным, прайшлі адзін скрозь аднаго, не размінаючыся, так, нібы абодва былі бесцялесныя, жывыя нябожчыкі...

«Во як выкруціў, — пачаў паціху прачынацца Купала. — Ведаю я, пра што Гамсун прасіў. Прасіў Нарвегію пакінуць Нарвегіяй... Прасіў захаваць незалежнасць краіны, не рабіць з яе пратэктарат... Прасіў спыніць гвалт, расправы... Прасіў, прасіў, прасіў... А Гітлер адказваў: «Гэта пасля вайны, пасля вайны, пасля вайны...» І ўсё б нічога, можна было б лічыць гэта місіяй і нават вялікім подзвігам, калі б пасля вялікай вайны і вялікай крыві вялікі нарвежац не напісаў: «Мы, верныя прыхільнікі Гітлера, схіляем свае галовы перад тварам ягонай смерці».

— Прачнуліся? — прайшоў да свайго стала Сталін. — Зноў снілі вашы беларускія сны? Дзяржаўнасць, незалежнасць? Цуда нейкага ўсё чакаеце?.. А там, — кіўнуў ён на дзверы, — камісар чакае.

Купала падняўся, падышоў бліжэй, каб развітацца, а Сталін сеў, узяў фотаздымак, пакінуты Гітлерам.

— Дзе гэта мы з ім?.. — перавярнуў ён фота. — Што тут напісана?.. — І ўголас прачытаў: «Іосіф, Манштэйн хоча на поўдзень, але я пашлю яго на поўнач. На Ленінград. Твой Вектар».

Купалу, можа быць, і здзівіла б тое, што ён пачуў, калі б не ўразіла тое, што ён убачыў. На павернутым да яго здымку Сталін з Гітлерам сядзелі на лаўцы ў Горках. На той самай, на якой сядзеў некалі ў Горках Сталін з Леніным.

— На Ленінград... — кінуў Сталін здымак на стол. — А сёння яны ўзялі Севастопаль. — І спытаў, тэлефонную трубку заклапочана падымаючы: — Як вы думаеце, нам вяртаць Крым?.. Мне дык болей Каўказ даспадобы.

На раздарожжах вечнасці



Алена ГІНЬКО

Самотная птушка

*Дзіўная, незразумелая,
ад палыну ап'янелая,
з вераю, спадзяваннямі,
з вечнымі расчараваннямі.
З золкамі і змярканнямі,
стрэчамі і расстаннямі,
з лекамі і атрутаю,
вольная і закутая.
З ружамі і рамонкамі,
ціхая — надта звонкая,
добрая — і найгоршая,
горкая — найсалодшая.
Птушкаю адзінокаю
лётае і галёкае,
будзіць абшары шэрыя
болем, трывогай, вераю.
...Вечныя супярэчнасці
На раздарожжах вечнасці.*

***

*Усё заблытана...
Загадка
ці нават тайна існуе.
Самота свой узор снуе...
Снуе самота свой узор,
а сэрца просіцца да зор.
Да зор?
Да Зорачкі-заранкі,
да светлай мары-калыханкі,
што вабіць, цешыць і хвалюе,
што ў сэрцы днюе і начуе...
Ці чуюць Зоркі нас, звычайных?
А можа, добра, што ёсць тайна?..
Дзе таямніца — там надзеі
і, дасць Бог, добрыя падзеі.*

***

*Прадчуванне блізкага дажджу —
быццам бы чаканне спавядання.
З ім хачу зацятасці іржу
змыць з душы, каб не было і звання.*

*Стоенасць прыроды данясе
да цябе патрэбу ачышчэння.
Ад праблем, што ўзычыў фарысей,
хочацца хоць нейкага збавення.*

*І калі праве на небе гром
гэтую затоеную роспач,
ты заплачаш ліўням наўздагон,
ты з прыродаю пабудзеш поплеч.*

*...Вось і дыхаць стала ўжо лягчэй.
Вочы ўжо дабрэйшыя, не тыя.
Хоць на споведзь не хадзіла йшчэ —
Мне цяжар з душы залева змые.*

***

*Зялёны ліст кранае пазалота,
калі ляцяць у вырай журавы...
Халодныя дажджы, туман і слота...
На скронях снег — гарчэй палын-травы.*

*Гарыць ліхтар агеньчыкам самотным
у цемры паміж сцішаных дамоў.
Іду адна вандроўнікам гаротным.
Ліхтар то ўспыхне, то прыцьмее зноў.*

*Шляхі і ростані... Святло і цемень...
Бясконца хваляй б'юся ў берагі.
А чалавек — пясчыначка, а не крэмень.
Дзе мой прыстанак і прытулак ад тугі?!*

*Дзе промень мой вясновы і гарэзны?
Дзе лецейка жаданае? Дзе май?
Трымціць душа струной надрэзанай.
...Трымай мяне, саломінка,трымай.*

***

*Прыгажуняю,
чараўніцаю,
падарункам чыйгось жытла,
яркай зоркаю Мілавіцаю,
называлі...
А... ці была?
Пекнай ягадкай,
гожай краскаю,
звонкай песняю ручая,
незвычайнай
чыёйсьці казкаю
называлі...
Была ж — не я...
За асокамі,
за аблокамі
птушка шчасця галёкае: дзе?..
Мо галёкае, адзінокая,
мо купаецца ў слёз вадзе?*

***

*Вечны канон — Бог-Любоў...
Верыла і Любіла,
і спатыкалася зноў.
Зноўку —
падножка —
боль.
Падаю...
Цяжка падняцца,
калі засмужвае золь.
Скрухай заснежаны тын,
дзе ўкрыжавана надзея,
дзе адзінокая...
Ты.*

***

*Усё ў свой час...
Усё — каму?
Каму — не ўсё...
Каму — нічога.
Усё ў свой час...
Для іх? Для вас?
А для мяне?!!
Ці часу многа?..
Ці часу шмат пакінуў Бог —
на бальшаку?
сцяжынцы ?
бродзе?..
Хай Бог сцярог
пустых дарог
да той, апошняй,
перад «годзе».*

Вясновае спляценне



Ірына ГРУМАНДЗЬ

***

*Белы пялёстак віёлы.
Сонечны сквер. Вясна.
Поўныя прыгаршні промняў —
радуецца дачка.*

*Кветкамі расквітнеем,
вераю заіскрым,
поўнае сэрца надзеі
у скверы на Страсным.*

***

*Вясновае спляценне
ўзораў
на галінках дрэў —
дыван зялёны
ў паветры
мастак павесіў,
намаляваўшы траўня
акварэль.*

***

*Горкая рэшта пасля размоў,
бы недапітая кава...
Звужана кола старых сяброў —
звыклая часам з'ява.*

У Селішчы

*Сыплецца цэгла з касцёла Святой Веранікі...
Сонцам асвечаны вежы —
Хрыстос на зямлі...
А ўначы мармуровы анёл
збірае цаглінкі,
плача дзяўчына,*



*зёлкі буяюць ля вечнай красы.
У Васілёвых малюнках
і вершах дзядзькі Рыгора —
плач Веранікі як памяць
жывога Хрыста.
Доўгай дарогай дадому
спатольвае стома.
Сыплецца цэгла з касцёла
над зоркай Рыгора ды Васіля.*

Зіма ў лістападзе

*Зіма — у лістападзе,
і холад нашых душаў,
як быццам хтось слязінкі
па снезе расцярушыў.*

*Блішчаць яны ўночы,
а нам абы сагрэцца —
і не заплакаць вочы,
і не астудзіць сэрца.*

*Зіма — у лістападзе,
бялютка-снежна-ранняя,
накінула на восень
сукенку развітальную.*

Кроплі

*Восень збірае
кроплі дажджом,
каб асвяціць ваду.
Ёю ўмыю рукі й вочы
ды ў зіму пабягу.*

*Кропля жывая
стане ільдзінкай,
срэбнаю і маёй.
Хтосьці ў небе
назваў Ірынкай
і акрапіў вадой.*

***

*Ёсць невыносныя ночы,
калі баішся пакахаць...
Ёсць такія вочы:
у бездань іх —
не пáдаць, а ўзлятаць!..*

Дзісенскае

*Там, дзе Дзісенка ўпадае ў Дзвіну, —
гулкай памяці звод.
У роснай раніцы патану
ў жніўеньскі хрэсны ход.*

*І Багародзіца паўядзе
радасцю вечных сіл —
то Адзігітрыя па вадзе
плыла пад небасхіл.*

*Богапрысутнасць стрэчы стрэч,
Богаз'яўленне... Шлях...
Веры людской сакральны меч
смерці разбурыць страх.*

***

Францу Сіўко

*Пах тытуню
і кава, толькі кава...
Размовы ў кулуарах
аб «Маёй душы».
Прароцтвы Вашы
творчасць прадказалі
кароткай фразай:
«Здольная, пішы!».*

Чайкі

*А чайкі праз хмары лятуць на святло —
не ведаць прыродзе марнасць
кватэрнага свету.
Крычаць пра дажджы й навальніцу
у вольнае неба — азёрнага краю жытло.
У птушак таксама ёсць
прага да вечнасці,
і птушкі таксама ўмеюць маліцца.*

*Знясілены крык —
нанізвае боль ды адчай
на струны душы чалавечай у хмарах.
У нябёсным святле патанае свяча
крыклівым агнём расстрачаных мараў.*

*А чайкі і ноччу лятуць на святло
да вечнага люстра спакою...
Пранізлівы крык — то крык пра жыццё
людскога кватэрнага дому.*

Караценькае

*Доўгі час знаходзячыся ў свеце няпраўды,
людзі пачынаюць свята верыць у яе.*

***

*Любоў — рэдкая прыгажосць сучаснага
свету.*

***

*Не думайце пра людзей добра.
Думайце пра людзей як пра людзей...*

Труп



Вячаслаў ЛАПЦІК

Маладая пстрычка гадоў дваццаці з абыякавым выглядам прыліпла да вакна тралейбуса, часам раўнадушна ўзіралася ў пасажыраў і, бачна, разважала пра свае праблемы. Побач з ёй сядзеў мужчына сярэдняга ўзросту ў расхрыстанай чырвонай куртачцы і без шапкі. Уражанне такое, нібы яму стала надта душна і ён вырашыў расшпіліцца. Праўда, месціўся неяк нязвыкла скасабочана, нібы яго моцна хапіў жывот, галава нізка апусцілася на грудзі, а рукі бязвольна звесіліся ўніз, лучыўшы якраз паміж каленяў. Іншаму магло падацца, быццам ён прыкімарыў пасля надта цяжкой працы.

— Дайце я прайду, — прыўстала дзяўчына і вышэй падцягнула сумачку на плячы, але той не адказваў, таму яна зноў паўтарыла пытанне мацнейшым голасам: — На Энгельса выходзіце?

Нахілілася да незнаёмага, але ён маўчаў і ніяк не рэагаваў. І тут дзяўчына ўпершыню перапужалася, убачыўшы застылае бязвольнае цела, жоўты твар і прыплюшчаныя вочы.

— О Божа! Жах! Ён жа мёртвы! — яна ўздрыганулася і разгублена зірнула на людзей. — Ужо не жывы!

— Вой-вой! — спалохана запішчалі дзве сяброўкі, якія сталі побач і пра нешта сакаталі; яны тут жа пацінуліся наперад, бліжэй да кабіны.

— Скапыціўся прама ў аўтобусе, ха-ха! Пэўна, учора, сабака, перабраў! — не да месца пажартаваў нейкі мужлан у пераношанай куртцы з выведзеным серпам і малатком на грудзях, моцна надарваным рукавом на плячы і збітых туфлях без шнуркоў на босую нагу, якога, відаць, зусім не хвалявала думка пра падатак за дармаедства.

Ён хацеў нешта дадаць, але на яго злосна цыкнулі, нехта нават мацюкнуўся, і народны гумарыст заціх, з прыхаванай усмешкай разглядаючы жоўты твар нябожчыка, быццам той прывабіў яго сваёй прыгажосцю.

Вакол ста́ла напружана і ціха, а пасля народ, быццам яго спырснулі нейкім ажыўляльным варам, зашавяліўся. Прапаноўвалі загнаць тралейбус на дыспетчарскую станцыю разам з мёртвым, дзе не спяшацца і ва ўсім спакойна разабрацца, уважліва пашарыць у кішэнях незнаёмага, знайсці сотавы, бо цяпер тыя маюцца ва ўсіх, нават у бамжоў, пасля чаго, раскрыўшы пошту пастаянных званкоў, пастарацца адшукаць жонку ці кагосьці з бліжэйшых сяброў. Нейкая цётка з яркімі румянымі шчокамі і занадта вялікімі для жанчыны вушамі, падкрэсліўшы, што мае непасрэднае дачыненне да медыцыны, хоць і не прызнаўшыся, чым яна там канкрэтна займаецца, вызначае камп'ютэрны дыягназ альбо цягае гаршкі з-пад паралізаваных хворых, прапанавала дужэйшым і смялейшым асобам мужчынскага полу забраць цела з сядзення, выцягнуць на вуліцу, укласці роўна на зямлю і пастарацца зрабіць штучнае дыханне: «У рот яму паветра я сама падпампую, у мяне лёгкія аб'ёмістыя, можа, яшчэ здрыганецца і ачуняе, а там, глядзіш, і сэрца затухае».

— Куды сунецеся, няўмекі? Не ведаеце нашых законаў! — раптам пачуўся ўладарны мужчынскі голас з хрыпатцой. — Выпадак смяротнага зыходу неабходна спачатку абавязкова зарэгістраваць у міліцыі, таварышы!

Так па-камандзірску цвёрда заявіў шыракаплечы дзядзька ў доўгім скураным плашчы, чорным капелюшы з цёмна-барвовай акаймоўкай і папкай пад пахай. Такія скуранкі насілі галоўныя героі ў фільме «Улицы разбитых фонарей», падобных чэкістаў народ моцна баяўся, хоць улюбёнец Уладзімір Высоцкі на экране таксама не спускаў з плячэй падобную апратку, праўда, не такую доўгую.

— Міліцыя павінна зарэгістраваць смерць на месцы і скласці акт, што ён памёр сам, без насілля, яго ніхто не душыў і нажом па жываце ці горле не паласнуў. — Знаток беларускіх законаў гляну ў высакамерна і з долей яўнай пагарды, пасля дастаў з кішэні насоўку і ў цішыні высмаркаўся, засунуўшы тую чамусьці ў папку. — Таму не выпендрывайцеся і выклічце органы.

Бляск цікаўных вачэй у салоне згас, і дзелавы гул рэзка заціх, жаданне дзейнічаць і нешта раскручваць далей у экстрымальнай сітуацыі знікла, палова людзей мэтанакіравана скіравала позіркі на незнаёца, які аддаў Богу душу, і тады пачуўся голас маладой пстрычкі: — Я нікуды званіць не буду, разбірайцеся самі, мала таго, што я сядзела побач з ім! Ён мне не бацька, не сват і не брат! У мяне без гэтага маса праблем.

З настойлівай мэтай пакінуць месца, яна падціснула сваю тонкую дупку, асцярожна ажыргала маўклівы труп, яўна баючыся дакрануцца да яго любой часткай цела, асабліва рукамі, каб не пакінуць адбіткаў пальцаў і каб пасля не прычапіліся следчыя структуры, і, ухапіўшыся за верхнюю парэнчыну, пралезла ў праход.

Пасажырапаток набраўся сіл, стыхійна і неадабральна зашумеў, кідаючы незадаволеныя позіркі на тую, якая збягае і не хоча трапіць у сведкі, — маўляў, ты сядзела побач з трупам і каму яшчэ, як не табе, хітрая прахіндзейка, званіць у праваахоўчыя органы. Прынамсі, самую аб'ектыўную інфармацыю і вычарпальны малюнак таго, што адбылося, можаш даць толькі ты.

— Дык хто паведаміць у міліцыю? — насядаў мэтр з папкай



у руках, які, бачна, усе неабходныя працэдуры вырашыў давесці да канца.

І чамусьці ўтаропіўся позіркам у мужыка, які месціўся на суседнім сядзенні за спіною трупа. Той ехаў ціха і мірна, ледзь не ўнурыўшыся носам у свой невялікі планшэт на каленях, пастаянна пальцамі шукаў нейкі тэкст, ганяў яго злева направа і мірна чытаў, ні на кога не звяртаючы ніякай увагі. Апрануты ў надта тоўстую цёмна-сінюю куртку са стаячым каўняром і вялікімі круглымі заклёпкамі бронзавага колеру на нагрудных кішэнях, якую спераду перавязаў доўгі і шырокі ланцуг; ён выглядаў вылітым гарналыжнікам. Да таго ж нацягнутая на галаву шэрая вязаная шапачка з бліскучым на ілбе чорным надпісам «Sport» дабаўляла яму спартыўнага выгляду.

— Тваю маць, чаго вы на мяне асталопна ўставіліся, нібы я нешта стырыў? — гаркнуў ён, быццам злуючыся, што ягоную ўвагу адцягнулі ад мілага планшэта. — Даўно не бачылі? Я нікому званіць не буду, знайшлі дурня! — рашуча зняў з каленяў і прыпадняў планшэт, быццам у жаданні шпурнуць некаму ў мосю, каб не чапалі і адсталі, а пасля апусціў той на старое месца. — Самі дзынкайце! Два гады назад мой знаёмы палез у сведкі, дык пасля апошнімі словамі праклінаў гэту сваю тупасць!

Апусціўшы галаву яшчэ ніжэй, зноў усунуў свой нос у тэкст на планшэце, шукаючы пальцам згубленае патрэбнае месца. Усім выглядам паказваючы, што з ім звязвацца няма сэнсу.

У праходзе каля памерлага стаяў, моцна трымаючыся за поручні, малады мужчына з кароценька заплеценай коскай на патыліцы. Ён глядзеў на труп з нейкай цікавасцю і лёгкай шкадобай.

— У вас недзе тэлефончык? — звярнуўся да яго ініцыятар з папкай і сур'ёзным тварам. — Пазваніце, калі ласка, у міліцыю.

— На жаль, не магу. Мне трэба спяшыць на працу, — ніводзін мускул не здрыгануўся на твары гэтага высокага падцягнутага мэтра ў чорным касцюме, белай кашулі і з гальштукам. Ён быў адарваны ад мірскіх праблемаў, думаў толькі пра сваё, магчыма, пра нейкія навуковыя даследаванні. — У мяне заканчваецца кантракт, і шэф можа абурыцца, чаму я ўвязаўся ў гэтую справу і толькі катаюся па мільтонах ды трачу вытворчы час.

Мажліва, ён цяпер абдумаваў ці будучыя навуковыя распрацоўкі, а мо напружана разважаў, маючы адносіны да беларускай інтэлегенцыі, пра існаванне роднай Бацькаўшчыны і прычыны, якія да гэтага часу перашкаджаюць стварэнню ў краіне скансалідаванага грамадства, ад чаго залежыць лёс нацыі. «Народ нейкі перапалоханы і нязручны, усе баязліва рассыпаліся па сваіх маленькіх загарадках, баючыся паяднанасці і новых змен у асабістым жыцці. Чым толькі іх можна захапіць і ўзняць з каленяў?» — Сёння займацца трупамі павінны толькі праваахоўнікі, мы птушкі невысокага палёту.

Гэтай шчырай фразай інтэлегент у касцюме і пры гальштуку канкрэтна адкінуў свой намер лезці ў гэтую справу.

Белакурая лахудра з неахайна рассыпанымі доўгімі валасамі, якія, здавалася, месяцамі не бачылі нармальнай расчоскі, што цяпер лічыцца модным, фыркнула зусім коратка: — Тут справа дабраахвотная, мае мілыя, нікога не прымусіш. У каго ёсць хоць кропелька сумлення — той і дапаможа нябожчыку.

Раўнадушна акінуўшы вокам труп, яна зняла чорныя пальчаткі і пачала папраўляць свае густыя кудры, нібы рыхтавалася выскачыць на сцэну тэатра, дзе ў першым радзе засеў каханік, што пачне прагна з'ядаць яе вачыма, а пасля за кілішкам сухога віна будзе даваць адзнаку яе выступленню.

— Я б мог пазваніць! — раптам ад кабіны шафёра праціснуўся бліжэй да трупа малады яшчэ бязвусы хлопец у шырокіх акулярах і са скуранай сумкай праз плячо. Пакорны, трошкі разгублены выгляд і нейкі зашмальцаваны падручнік у руках гаварылі пра тое, што ён, хутчэй за ўсё, студэнт, а цяпер рыхтуецца да нейкага экзамену ці заліку.

— Во малайчына, давай-давай! — скінула з сябе дакуку і радасна зашабуршала сваімі галасамі і адзненнем палова тралейбуса, адчуўшы расслабленасць у душы і целе. Народ ажыў і захваляваўся, ён убачыў сярод сябе лідэра і ў такой справе захацеў яго падтрымаць.

— Ты малады, нічым не звязаны — табе і карты ў рукі! — рашуча заявіў мэн з папкай.

Ад несцярпёжкі людны салон загаманіў і захітаўся, нечаканы выхад з няпростай сітуацыі многіх натхніў і нават абрадваў. Народ забурліў, на «ўра» прыняўшы тое, што знайшоўся раптам крайні, хто бярэ на сябе смеласць і клопаты па няпростай валакіце з нябожчыкам, а ўвесь цяжар адказнасці спадае з іх плячэй. Выдавала, што падобнага толькі і чакалі, і цяпер кожны разумеў, што з'явіўся момант спакойна выйсці з няпростай сітуацыі, перакінуўшы адказнасць на плечы іншаму.

— Але ж, ведаеце, ёсць праблема, — смелы студэнт, глядзячы на застылага нябожчыка, пачухаў кніжкай за вухам.

— Што-што, дзялок? — зноў той самы знаёмы мужчынскі бас незадаволена гаркнуў здалёку, аж з задняга сядзення.

Тралейбус ажыў у гамонках і выкрыках, поўных эмацыянальнай злосці:

— Во дае, як дурное дзіця!

— Не бойся!..

Кожны хацеў паказаць сябе добрым і цывілізаваным чалавекам, сумленным і прыстойным, тонкім знаўцам чалавечых адносін, стараючыся як мага хутчэй зняць з сябе нагрузку і долю маральнай ды юрыдычнай віны за тое, што адбывалася ў салоне.

— Што, таварыш, вас турбуе? — дзядзька з папкай канчаткова вырашыў прыцiснуць іншадумства адзіночак у салоне.

— Мой сябрук Ігар два гады назад у міліцыі пагадзіўся на сведку, калі ні за што хуліганы пабілі на вуліцы ягонага суседа, — спакойна пачаў тлумачыць юнак. — Дык ён пасля сказаў, што праклінае той дзень, калі з хлопцамі ў форме звязаўся. Цягалі яго як на допыты год, усё нешта пісалі і прыдумлялі, афармляючы справу, а Ігара забаёдалі, — прыпамінаў худы юнак з сумкай праз плячо.

— Не сцы, труслівы сярун! — з задняга сядзення знаёмае хамло сказала па-мужчынску прама, нават не звяртаючы ўвагі на жанчын і на тое, што дзяржава быццам лічыцца еўрапейскай.

— Не будзь сікунчыкам, смялей глядзі на жыццё! — заўважыла кабета ў кароценькім сабалiным футры. — Не трэба так грашыць...

— Не, прабачце, мне трэба сядзець на лекцыях, я адказваюся! — бачна, абзыўкі і знявагі вывелі спакойнага хлопца з сябе. — А што да граху... Дык вы ж яго набіраецеся тут больш за мяне...Сваімі павадкамі...

Зноў стала ціха, пасажыры пакрыўдзіліся на студэнта, бо не заўважалі свайго граху, прыкідваючы, адкуль таму быць, калі яны вядуць сябе з годнасцю, вакол усё нармальна і ніхто не парушае дзесяць асноўных запаведзяў Гасподніх.

Але ж прастора для бязглуздых фантазій надта вялікая, нехта прапанаваў зусім нечаканы варыянт: маўляў, чаму мы павінны аддувацца, няхай за справу возьмецца кіроўца, якога хрэна ён, малады хлопец, сядзіць за сценкай і ні на што не звяртае ўвагі: «З нас дзякія грошы за праезд дык дзёрці мастак, а тут заціх!» Спачатку няхай выклікае кантралёраў, тыя патрасуць кішэні нябожчыка, і калі пераканаюцца, што труп безбілетны, ім ёсць магчымасць тут жа звярнуцца ў міліцыю з мэтай высвятлення

пашпартных дадзеных мёртвага пасажыра для складання пратакола за неаплочаны праезд.

— Чаго вы да гэтага маладога піжона з кніжкай прысталі? — раптам пачулася ў салоне.

— Відаць, студэнта сорам не бярэць, і даўно страціў сумленне! — улезла ў размову шырокая цётка з вялікім круглым тварам і нахабнымі вачыма, а ўвесь ейны выгляд быў задзірысты і ганарлівы, нібы яна толькі і чакала моманту да некага прычапіцца і добра ўваліць. — Я б магла стаць сведкай, прытым прынцыповай, мяне проста так не ўламаеш, але аднойчы мне ўжо моцна памялі бакі і запёрлі ў СІЗА.

— У-у-у, — спачувальна пачулася ў тралейбусе. — Няшчасная...

— Я ж іпэшніца, і не раз з мільтонамі спрачалася да пасінення, дамагаючыся не чапаць мой тавар і дазволіць рэалізаваць. Таму зноў у органы не палезу, бо хачу трошкі пажыць. Мне трэба грошы зарабляць!..

Яна выглядала зарана распаўнелай і злоснай, бабай, якой у рот пальцы не кладзі, што прывыкла бескампрамісна кіраваць і мёртва стаяць на сваіх пазіцыях; відаць, добрыя сумы ад рэалізацыі завезенага заморскага тавару і пастаянныя сутычкі за сваё месца з вечна незадаволенымі гаспадарамі рынку з іх настырнымі памкненнямі выдраць з яе любым шляхам максімум грошай, выхавалі з яе істоту гарластую і непрымірымую.

— Хопіць гаўно ў ступе таўчы, спекулянтка, гані сваю прапанову! — зноў пачуўся недзе з задняга сядзення незадаволены бас. — Давай, шалава, канкрэтна па справе!

Каб не гэта надзвычайнае здарэнне, маецца на ўвазе смерць чалавека, таго незадаволенага крыкуна, магчыма, сурова паднялі б з месца і нават прысаромелі перад аўдыторыяй, напомніўшы, што ён еўрапейскі пасажыр, які лічыцца членам Мытнага саюза, а не нейкі нямыты голы афрыканец з кампаніі «Чорнае балота» па пошуку брыльянтаў, таму павінен весці сябе культурна і належным чынам, нікога не зневажаць і нікому не хаміць, тым больш у белы дзень і жанчыне-іпэшніцы, але ж цяпер не было часу займацца падобнай працэдурай выхавання, бо ў салоне знаходзіўся мёртвы пасажыр.

Іпэшніца яўна хацела заткнуць рот дурному басісту з задняга раду, але ж гэта яна пакінула на пасля, бо трэба спачатку разабрацца з трупам у салоне. Трэба было адказаць грубасцю на хамства, бо да падобнага яна прывыкла, але ж цяпер прамаўчала. Гэтая мажная цётка не прывыкла, каб ёй кіравалі — сваёй камплекцыяй заняла адно сядзенне і яшчэ палову наступнага, дзе паставіла збоку каля сябе два вялікія цэлафанавыя мяшкі, туга набітыя таварам. Але ёй ніхто заўвагі не рабіў і не хацеў увязвацца ў дыскусію з такой грамілдай.

— Слухайце мяне, арлы і вароны! — гэта таўстуха яўна перахапіла лідэрства ў мужыка з папкай. — Не шукайце сведкаў са звычайнай публікі, каго можна лёгка пасадзіць на асінавы кол. Гляньце, хто сярод нас пенсіянер? Няхай той дзынкніць у міліцыю, бо яму ўжо няма чаго дрыжаць.

— Маладзец, баба, маеш на плячах галаву, а не жопу, — зноў нехта з «хваста» высока ацаніў разумовыя здольнасці і лагічнае мысленне грузнай пасажыркі.

І дзясяткі вачэй запытальна ўставіліся ў дзядка гадоў за семдзесят. Быў ён невысокага росту, але прысадзісты і яшчэ ў сіле, апрануты ў доўгі пінжак, яўна з чужых плячэй. Напакаваная нейкімі сумкамі з брызентавым заплечнікам па цэнтры шырокая каляска на маленькіх калёсіках гаварыла пра тое, што той хутчэй за ўсё вяртаецца з дачнага ўчастка.

— А ху-ху вы не хо-хо? Чаго ліпеце да мяне? — надзіва тоненькім бабскім галаском раптам завішчаў той. — Думаеце, калі я пенсіянер, дык дурнейшы за вас і з мяне можна здзекавацца? Не, паважанае спадарства, маю плоць так не адолееш, не на таго нарваліся! — Ухапіўшы сваю каляску з вандзэлкамі, паціснуўся бліжэй да выхаду.

— Дзед, чаго ты... пукаеш? — бачна, непадпарадкаванне старога іпэшніцу адкрыта раздражняла. Яна магла заціснуць сваёй настырнасцю, зблоціць любога ўпартага спрэчніка і задзяўбсці аглушальным крыкам, прыглушыўшы таго пры неабходнасці бруднымі мацюгайламі, праўда, апошні арсенал зброі яна пакуль не прымяняла, разумна ацаніўшы месца сутычкі.

— Ты... гэта самае... пукаеш за мяне, бо таўсцейшая ў тры разы! — нечакана адпарыраваў стары. — Я ўжо ў гадах, і часта лятаць да паліцмайстараў не ў сілах нават і па павестках! — пісклява даказваў дзядуля. — Я да іх, як сведка, бегаць не змагу, праігнараваўшы выклікі, яны на мяне моцна раззлуюцца. Ад пенсіі адымуць яшчэ рублёў трыццаць ні за што...

Штурхаючы пасажыраў пад бакі і не звяртаючы ўвагу на пратэстныя воклічы, языкасты вёрткі дзядок папёрся да дзвярэй, зачапіўшы жалезнай ручкай каляскі няшчасны труп і нават абваліўшы на павароце яго набок і падсунуўшы на суседняе сядзенне, дзе нядаўна ёрзала дупкай маладая дзявашка.

«Жа-ах! Стары корч! Дзе тваё сумленне?» — дружна запратэставалі ў салоне, спачувальна гледзячы на мёртвага пасажыра, а мужык у скураным паліто нават замітусіўся і пачаў раскрываць сваю папку ў жаданні запісаць пашпартныя дадзеныя адурэлага старога, каб пасля заявіць у адпаведныя дзяржаўныя інстанцыі.

«Пайшлі вы ўсе! — не здаваўся дачнік, — можа цяпер мяне пачнеце душыць?» — і ламаўся з самадзельнай іржавай каляскай наперад.

На наступным прыпынку пенсіянер хуценька выскачыў за дзверы, спешна выцягнуў сваю каляску, ледзь не перакуліўшы яе на апошняй прыступцы і не скінуўшы на асфальт заплечнік.

Натоўп зноў завіраваў, напружваючы набыты інтэлект і шукаючы аптымальны варыянт выйсця з няпростай сітуацыі, які б задавальняў усіх, але ж ніяк не мог яго знайсці. Тады зноў у гутарку ўлез уладальнік тоўстай чорнай папкі.

— Я ведаю, што зараз атрымаецца, паважаныя таварышы, — заклапочана давёў ён і спецыяльна зрабіў доўгую паўзу, каб выклікаць да сваіх слоў паболей увагі, што прымусіла пасажыраў трошкі прыціхнуць і так моцна не праклінаць старога дачніка з каляскай. — На канечным прыпынку кіроўца аўтобуса проста заблакіруе дзверы, запёршы людзей у салоне, і выкліча мільтонаў. Гэта значыць, тыя, хто застануцца, не па сваёй волі стануць сведкамі, бо ўсіх перапішуць і ўвядуць у міліцэйскія пратаколы.

— Адурэць, сраныя сукі! — тое самае смелае хамло зноў узарвалася на заднім сядзенні. — Ухопяць пашпарт — запішуць у туніядцы! Не хапала, каб маё прозвішча гуляла ў паперах падаткавікоў...

— Так заціснуць, што аддасі ім усё, што патрабуюць, нават больш! — зрабіла свой каментарый знаўца тонкасцяў работы падаткавікоў іпэшніца, хуценька згрэбла вялікія вандзэлкі з сядзення і настырна паціснулася да дзвярэй. — Эй там, наперадзе, выходзіце?

На перадапошнім прыпынку, імпэтна штурхаючы і ціскаючы адзін аднаго, нібы баючыся, што дзверы раптам перад носам захлопнуцца — і яны не паспеюць выскачыць, народ густой лавінай паваліў з тралейбуса, а малады кіроўца не мог спачатку ўцяміць: няўжо тут, на пустыры, сёння адчыняюць «Еўраопт» з вялікай зніжкай на тавары? А мо шматлюдную дэманстрацыю закруціла нейкая апазіцыйная партыя: «Гэта ж трэба, нарэшце ўдалося сабраць масу людзей! А то ўсё плачуць: народ наш аморфны ды пасіўны і на мітынгі нікога не загнаць і калом!» Глянуўшы на экран унутранага відэаназірання, убачыў усярэдзіне толькі аднаго паніклага пасажыра, які неяк ненатуральна скруціўся і, звесіўшы рукі, улёгся на сядзенні: «Яшчэ рана, няўжо так недзе надзюбаўся?»

На апошнім прыпынку ён спыніўся і заскочыў у тралейбус, схіліўся над небаракам і тузануў таго за плячо: «Канечная, прачніцеся, пакіньце салон!» Але ж пасажыр не рэагаваў, і толькі тады шафёр зразумеў, што адбылося.

«Не мне ж з ім цягацца! — ён адчуў, як халадок прабег па целе, і нейкі мандраж з'явіўся ўнутры. — Няхай займаецца дыспетчар, яна дзеўка маладая, атрымоўвае прэмію не меньшую за маю, і ёй прасцей размаўляць з праваахоўнікамі...»

Тралейбус чмыхнуў і ціха павярнуў на дыспетчарскую пляцоўку...

«Закапайце мяне на градках з агуркамі»



Кастусь КАЛЮЧЫ

— Можа, давайце перакусім? — праз прыадчыненыя дзверы мама дае зразумець, што прыспеў час абеду.

Сашка злазіць з даху веранды, і мы ўчацвярых сядаем за стол. Мама дастае з печы чыгунок з бульбай і мясам. Водар прымушае як мага хутчэй узяцца за відэлец. Першыя хвіліны ядзім моўчкі. Потым брат пытаецца: з якога года наша хата?

— Па паперах — сорак пятага, — адказваю я.

— Тое, што яна збудаваная пасля вайны — гэта дакладна, а як там яны ў дакументах напісалі... — мама з недаверам ставіцца да людзей з дзяржаўна-бюракратычнага апарату і, павярнуўшыся да Сашкі, прапаноўвае салёны агурок. — Будзеш?

— Калі дасі — буду, калі не дасі — не буду.

Кацярына, мая сястра, усміхаецца і таксама цягне руку да слоіка. Сашкавы жарты заўсёды паўтараюцца. Але ўсё роўна цікава паслухаць, з якой інтанацыяй ён іх вымаўляе і як рэагуе на прапанову цёткі (маёй маці) з'есці яшчэ што-небудзь пасля таго, як знікла з талеркі другая дабаўка. Ён — галоўная «моц» у нашай справе, таму падтрымліваць гэтую моц мама лічыць надзвычай адказнай справай.

Пасля гарбаты выходзім з братам на двор. Абодва глядзім на «фронт працы». Замест старой веранды ўжо акрэслілася новая, якую будуем, лічы, з нуля. Падмурак, праўда, пакінулі стары, хаця яго прыйшлося тамсям падмацаваць. Сцены, абшытыя навюткай вагонкай, яшчэ пахнуць хвояй. Дах таксама новы. Толькі яшчэ не ўстаўленыя вокны.

— Ну што, заліваем сёння ганак? — відаць, што брату (ён працуе на будоўлях) карціць зрабіць новыя прыступкі. Я не паспяваю выказаць згоду, як Кацярына выходзіць з хаты і аб'яўляе, што вокны таксама — яна так вырашыла — будуць новыя, а не старыя, якія мы хацелі ўсталяваць. Яна нярэдка бянтэжыла мяне раптоўнымі рашэннямі і дзеяннямі, на абдумванне якіх я змарнаваў бы нямала часу.

Каб крыху адпачыць пасля абеду, іду праз дарогу на другі ўчастак. Там адкрываецца цудоўны від на наваколле. Бачныя



суседнія вёскі ўздоўж возера, купка лесу, поле, дзе калісьці пасвілі кароў. Лісця на дрэвах ужо няма, неба амаль увесь час шэрае, але гэта не замінае адчуць асалоду ад дзіўнага спалучэння восеньскай тугі і замілавання наваколлем, якое мае сваю адвечную прыгажосць, нягледзячы на пахмурнае надвор'е.

Нас чамусьці цягне ў гэты закінуты куток. У вёсцы амаль не засталося карэнных жыхароў, ды і ўлетку, калі прыязджаюць дачнікі, палова двароў пустуе. Я магу зразумець маму, якая тут нарадзілася і дзе жылі і памерлі яе бацькі і сваякі. Але да канца не магу ўцяміць — што можа цягнуць сюды маё пакаленне.

Думаю, не толькі рыбалка прываблівае сюды Сашку. Нядаўна я даведаўся, што старую веранду рабіў яго бацька, таму, падазраю, новая веранда будзе для яго своеасаблівай данінай памяці.

Не ведаю, што сюды вабіць сястру. Гэта спроба схавацца ад гарадской мітусні?

А можа, гэта наш нацыянальны код ці, прынамсі, яго частка? Бо кажуць, што беларусы — сялянская нацыя. Не ў сэнсе абразы — так ёсць насамрэч. Калі эліты вагаліся ў выбары, якой нацыянальнасці ім быць, а большасць насельніцтва гарадоў былі ўвогуле чужынцы, беларускасць, загнаная пад стрэхі, потым выбухнула і трансфармавалася ў паўнавартасную нацыю.

Я гляджу на ўзараную зямлю і згадваю фота, на якім мой бацька стаіць у дыхтоўным гарнітуры (настаўнік з вышэйшай адукацыяй) паміж градак, як гаспадар, і ўсміхаецца. Гэтыя градкі былі яго хобі, а яшчэ, заўважу, давалі неблагі дадатковы прыбытак. Аднойчы бацька пажартаваў: калі памру, закапайце мяне там — на градках з агуркамі.

— Братка, ці ты там заснуў? Можа, дапаможаш? — крычыць здалёк Сашка, перарываючы мае думкі.

Пакуль іду назад да хаты, у галаве мільгае: я не хачу і наўрад ці буду тут стала жыць, але дакладна ведаю, дзе я хачу быць, калі мяне не стане.

Не, безумоўна, не на градках з агуркамі...

Прастора, якую знойдзеш



Пётра МУРЗЁНАК

Ачышчэнне агнём

«Бо ніщто не ўзвысіць вас лепей
Як любоў да памерлай альбо памерлага
Душа робіцца гэткаю чыстаю
Што нават цераз лядовыя пліты памяці
Можна злучыцца са сваімі ўспамінамі
Тады чалавек праз усё жыццё
Такую моц адчувае
Што яму непатрэбны болей ніхто».

(Guillaume Apollinaire, «La maison des morts», 1913.
Пераклад з французскай Лявона Баршчэўскага)

Познім вечарам у суседнім доме
здарыўся пажар,
а я сядзеў за кампутарам,
чытаючы Апалінэра,
і нічога пра гэта не ведаў;
быццам бы нешта адзін раз выбухнула,
здаецца, на вуліцы завыла сірэна,
але я ў гэты час
шыбаваў побач з узрушаным Гіёмам
вуліцамі Мюнхена
ў радасным, з'яднаным натоўпе
жывых і мёртвых.

Так, гэта ён,
абураны парадвасцю мяшчан,
што прыйшлі на хаўтуры,
вывеў на шпацыр мёртвых,
мужчын, жанчын, дзяцей,
усяго сорак дзевяць асоб,
каб з'яднаць іх з жывымі;
мёртвыя моцна цешыліся,
жартавалі з уласных ценяў...

Як жа трэба было не ўзлюбіць жывых,
Каб палюбіць мёртвых і шпацыраваць з імі?..

Я не паспеў дачытаць гэты твор (апошнія радкі,
якія вы бачыце ў якасці эпіграфа),
як мне прынеслі трывожную навіну пра пажар;
калі б мяне не паклікалі,
то, магчыма, толькі на раніцу
заўважыў бы абгарэлыя астанкі гаража
каля выратаванага пажарнікамі дома,
і цяпер працягваў бы
сваё падарожжа з Гіёмам,
каб даведацца, чым яно скончыцца.

Я выскачыў на вуліцу,
напоўненую
непамерным горам і трывогай,
змешанымі з дымам,
з пахам гарэлай гумы
і вясенняга дарожнага пылу,
узнятага лёгкім першым дождж
ыкам
і мноствам машын,
заняўшых усю прастору вуліцы;
шумела тэхніка, бліскалі трывожныя
align
розмакаляровыя лямпачкі
амбуланцый,
пажарных і паліцэйскіх машын, —
усё разам выглядала
фантасмагарычна,
як у галівудскім фільме
з чарговай катастрофай.

Якраз у гэты момант, калі
з прыадчыненых дзвярэй суседскага гаража
высока шуганула полымя,
мільганула небяспечная думка:
сёння раніцай, з таго боку, дзе гарыць,
дзьмуў моцны вецер;
а што, калі ён прынясе агонь да маёй хаты?
Аўтаматычна адчыніў дзверы свайго гаража,
каб пры неабходнасці выкаціць машыну.
Але насамрэч —
што маю каштоўнага, каб ратаваць?!
Хіба дыпломы, сямейныя архівы?!
Што станецца, калі дом згарыць?
А што каштоўнага ў ім застанецца,
калі не стане мяне?

Па вуліцах Мюнхена ідуць 49 радасных людзей,
да якіх далучаюцца старыя, знаёмыя і сваякі.
Яны ідуць разам і
ўжо нельга адрозніць жывых ад мёртвых;
маладзёны прызнаваліся ў каханні,
дзеці гралі на жалейках,
было многа выпіта,
у полі падчас забавы
пары, абняўшыся, танчылі,
пасля ўсе пайшлі на возера,
каталіся на лодках, і
памерлыя веславалі з такім жа настроем,
як і жывыя ...

Іх лучыла роўнасць і памяць.

Памяць аб продках са мной.

Значыць, адну каштоўнасць я ўжо выратаваў.
Памятаць і любіць можна
толькі знаёмых і блізкіх памерлых.
Але як доўга трэба любіць жывых,
каб пасля помніць іх,
калі яны ўжо будуць на іншым свеце?
Ці можна памятаць і не любіць?

Супакойваюся. Азіраюся.
Навокал групкамі стаяць людзі;
Бачу знаёмыя, жывыя твары суседзяў,
але яшчэ больш заўважаю навокал
бляклыя і незнаёмыя твары.
У водблесках пажару
і мігалак службовых машын
і адны, і другія выглядаюць
амаль аднолькава,
бы не з гэтага свету,
як застылыя манекены,
выстаўленыя ў вітрыне.
І адны, і другія дзівяцца
на відовішча і гора,
але толькі першыя,
у адрозненне ад другіх,
хвалююцца яшчэ і за сябе.

Павольна пераходжу
на другі бок вуліцы,
хтосьці з суседзяў мяне паклікае.
Як у нейкім сне, адзываюся
звычайнымі ў такой сітуацыі фразамі;
гэта суседзі праз вуліцу,
якія пасяліліся тут два гады таму,
якіх я бачу і з кім вітаюся
амаль кожны дзень.
Сёння яны памятаюць мяне таксама.

Прайшоў крыху далей
і стаў насупраць палаючага будынка.
З аднаго боку ад мяне
стаяў хлапчук з веласіпедам,
а з другога мужчына,
якога я, як быццам бы, недзе бачыў.
Мужчына аказаўся
суседам па дыяганалі,
яго завуць Майк.
Пастараюся запомніць хаця б яго імя,
звычайна мне гэта ўдаецца
як мінімум з другога разу.

А вось хлапчук раптам запытаўся,
ці не рускі я?
Я беларус, увогуле рускую мову добра ведаю,
але адказаў машынальна
па-ангельску;
мой адказ быў сэнсоўны,
а якая цяпер розніца, хто я тут на пажары.
Магчыма, я пакрыўдзіў гэтага хлапчука,
бо ён заўважыў, што бачыў мяне раней,
калі аднойчы
прыходзіў у наш дом з маім унукам;
гэты хлапчук падрос і змяніўся за пару гадоў,
я яго не пазнаў і фактычна не помню,
а ён мяне памятаў.

Было відавочна,
што пажарныя спраўляюцца з сітуацыяй,
агонь быў суцішаны імі,
дапамога ім была не патрэбна,
і каб не мокнуць пад даждж
ом,
рушыў дадому дачытваць Апалінэра;
жывыя твары маіх суседзяў,
якія былі мне знаёмыя і якія помню,
і незнаёмыя зусім твары
пачалі знікаць у цемнаце,
туды, адкуль былі выцягнуты
цікавасцю, відовішчам
ці спачуваннем.

Наўрад ці давядзецца зноў
сустрэцца з незнаёмымі гледачамі
на гэтым ці на другім свеце,
а калі й будзем побач,
то ніколі не пазнаем адзін аднаго.
А каб мацней любіць
ужо крыху знаёмых мне людзей —
няўжо трэба палюбіць мёртвых?
Як жа трэба любіць мёртвых,
как палюбіць жывых!

Лодкі прысталі да берага,
Апалінэр з грамадой вярталіся ў горад,
Але вясёлыя забавы працягваліся:
Дзеці гралі на свістульках з дзікага бэзу,
Вайскоўцы спявалі тырольскія песні,
Закаханыя цалаваліся...
Але ў горадзе грамада хутка паменшыла,
і Гіём застаўся адзін з памерлымі,
якія ішлі — хто на могілкі,
а хто ў пахавальны дом,
дзе Гіём упершыню іх пабачыў.

Я быў на вуліцы хвілін дваццаць
побач са знаёмымі
і зусім незнаёмымі мне людзьмі,
якія выглядалі на адзін твар,
у той час, калі там палыхаў агонь,
і там яшчэ мацней высвятлілася
маё жаданне:
каб мяне любілі і помнілі
як мага больш людзей
пры жыцці,
а не ўспаміналі,
чытаючы некралог.

Казка казкаю застаецца



Вадзім КОРАНЬ

* * *

На пачатку было Слова.
Усе гэта ведаюць. Нічога новага.
Але ж якое Слова на пачатку было,
калі сонца ў небе ўпершыню ўзышло?
Цяпер мы ведаем шмат слоў:
можам па-англійску,
па-нямецку,
а нехта і на эльфійскай мове.
Хтосьці нават прыдумаў бальбуту,
якую я не ведаю, але гучыць крута.
Ды няважна гэта, другасна, неістотна,
бо нават з мовай кожны з нас самотны,
калі не ведае Слова,
што было на пачатку,
якое нехта Невядомы напісаў асадкай
на сэрцы кожнага, хто прыходзіць у гэты свет,
толькі камусьці яно вядомае, а для кагосьці — сакрэт.
Яно нябачна выбіта на дзвярах кожнага храма:
«МАМА».
Яно на ўсмешлівых вуснах кожнага дзіцяці
і стогадовага старога ў бацькоўскай хаце,
які самотна паміpae
і чакае,
што калі адчыняць райскую браму,
ён убачыць і абдыме маму...

На пачатку было Слова...
І Слова першае самае —
«МАМА»...

* * *

Казка заўсёды толькі казкаю застаецца
і што там усё добра нам толькі здаецца.
Чырвоны Каптурок ужо не тая, што раней:
пасталела і перабралася ў горад — там зручней,
больш сродкаў і магчымасцяў зрабіць кар'еру,
хоць спачатку ўладкавалася звычайным кур'ерам.
Стамлялася на працы. Сустракалася з дрывасекам,
які спрабаваў зацягнуць яе ў секту,
і яшчэ не вядома, што б з ёю сталася,
калі б збегчы адтуль не атрымалася.
Пасля сустракалася з добрым хлопцам,
але праз паўгода ён пачаў калоцца,
а потым узяў і выйшаў з кватэры,
толькі пераблытаў акно і дзверы.
Потым сама яна нешта прымала,
бо было балюча — яна ж кахала...
Маці знайшла старога багатага прынца
і павандравала па еўрапейскіх сталіцах.
Яна сабралася хутка,
ажно забыўшыся развітацца,
сказала толькі: «Трэба й сабою заняцца!»
Бабулю падманулі:
яна ўсё, што было, аддала пад заклад,
бо ёй паабяцалі новы дом і вялікі сад.
Аддала нават сваю дыядэму срэбраную —
узнагароду на даўнім конкурсе прыгажосці.
Жыла ў доме састарэлых, нікому непатрэбная,
і ўсё чакала, што да яе прыедуць госці.
Не прыехаў ніхто. І памерла, пакінутая ўсімі:
унучцы пляваць, а дачка з кавалерам — у Рыме.
Што казаць, іх нават не было на пахаванні,
якое прайшло без слёз і ў сумным маўчанні.

Але ж усё магло быць і зусім інакчай...
Ну, што ж, гэта на дзіва простая задача.
Возьмем кніжку, адгартаем назад,
бы плёнку ў кіно:
дзяўчынка праз змрочны лес бяжыць з усіх ног
да любімай бабулі, нягледзячы на страх,
і лёс гэтай дзяўчынкі — ва ўласных яе руках...

* * *

Штодзень дадаю ў верш слова.
Штораз верш становіцца большым на слова.
Аднойчы ён набудзе форму,
знерухомее
і завершыцца.
Але я,
паставіўшы кропку ў канцы апошняга радка,
ані прачытаць
яго ад пачатку
не змагу,
ані паправіць.
Так і пішу —
чыставік.

«Хіба паэзія гэта толькі словы?»

Выйшаў з друку чарговы 94-ы нумар часопіса «Дзеяслоў». Вельмі шырокі спектр публікацый — ад жанрава-мастацкіх да геаграфічных. Думаю, нават самы пераборлівы літаратурны гурман знойдзе тут спажыву для сваёй элітарнай пажаднасці.

Ды можна сказаць, тут яму далёка і адыходзіць не спатрэбіцца, бо публікацыі пачынаюцца... з вершаў **Сяргея Дубаўца.** Адчуваецца, што вершаваныя тэксты для вядомага крытыка, публіцыста і празаіка — гэта як бы новае мастацкае (паэтычнае) слова пра ўласны духоўны свет. Чыталася з цікавасцю і свежа ўспрымалася. Сам паэтычны цыкл «Мяне ніколі не любілі геніі...» (вершы з Вісбю) раздроблены на ўмоўныя раздзелы, але падаецца цэльным і ўнутрана завершаным.

У Вісбю жыве дзяцінства. Узгоркі, вуліцы,
домікі, ліхтары пакінутыя — як тады. Не
знесеныя ўзгоркі, вуліцы, домікі — «жыдоўскія
клапоўнікі», ліхтары — як у Мазыры, як
у Менску. У Мінску няма дзяцінства.

Аповесць **Франца Сіўко** «Раз — шкілет, і два — шкілет» — гэта жывая, і для многіх старэйшых яшчэ помная карціна вясковага жыцця і бытавання ў хрушчоўскія 60-я ды яркія запамінальныя вобразы і характары саміх вяскоўцаў. Апісанне дзей, сюжэтна закручаны (а часам і занадта перакручаны) іх ход і злом, у складку з сакавітай тагачаснай мовай міёршчыны (імёны: *Карольця, Зыгман, Тадзік...; слоўцы: лехі, непярэліўкі, спадкі, флянцы, вызвалка, слясак, кятурак...*) ствараюць уражанне яшчэ цэльнага нацыянальнага жыцця беларускага, няхай і савецкага, краю. Шчыра кажучы, уласна мяне не так забавіла і трымала пры тэксце яго псіхалагічная фабула ды ідэйны філасофскі змысл, як вось гэтае натуральнае адчуванне сваёй істоты ў тым захаваным у памяці і па-мастацку пераствораным айчынным свеце. Уся сутнасць аповеду пакладзена ў абвостраных стасунках блізкіх па роду людзей (ад дзядоў да ўнукаў) у прыкладна такім парадку: віна, грэх, прага споведзі і раскаяння... А па-над усім — любоў...

«Ён жа, што праўда, жончыну смерць перажываў куды цяжэй, чым нават калісьці смерць бацькоў, не таму, што, можа, спалохаўся цяжару адказнасці за сыноў. Не, іншае, куды больш таемнае і глыбокае, больш асабістае да таго прычынілася. Сышоў чалавек, які быў адзіным, хто гэтак шмат пра яго, Тадзю, ведаў. І ведаў, і разам з тым заставаўся запарукаю спраўджанай надзеі на дараванне — калі не Божае, дык хаця б людское. А як Карольці не стала, і яна, гэтая апошняя надзея, сіратлівым прывідам заблукала ў закутках свядомасці. Жыць з такім успамінам — канечне ж, няпроста. Бо хоць і не смыліць ён штодня, і не даймае штохвіліны, і не пераследуе кожнае начы, але ж і таемных спратаў мінулага дарэшты, такая-разгэткая сволач, не пакідае. Гадамі можа не трывожыць, а варта неўспадзеў нейкай дробязі вылузнуцца ў памяці — і тае ж хвіліны нагадае пра сябе. І чым далей у жыццёвы гушчар, тым больш сувора, больш жорстка, нягоднік, нагадвае. І плішчыцца тады жывасілам у душу, пячэ прадаўнім тым, страхавітым успамінам пра злашчаснае...»

Вершы **Аксаны Данільчык** даволі частыя госці на старонках часопіса. Чытаючы іх, адухаўляешся і чысцішся ад напластаванняў надзённай быційнасці. Большасць яе твораў звернутыя ўнутр сябе. Знешне яна вартуе сваю прастору, але не дае рады абмежаваць яе дарэшты:

Нават калі я блізка
нават калі я непазбежна блізка
я ўсё роўна далёка

Таму зразумелыя такія пасылы да чытача і тлумачэнні ўласных паэтычных парываў:

Хіба паэзія гэта толькі словы,
толькі словы ці знітаванасць?
Я проста ішла, бо можна ісці, не спрабуючы
дасягнуць мэты, а спасцігаючы свет па-за межамі
ўласнай абмежаванасці.

Адметны празаік Валеры Гапееў друкуе ў часопісе фрагменты новага рамана «Пазл». Цікава, што калі папярэдні яго твор «Ноч Цмока» быў спадзяваннем на нараджэнне чалавека, нацыянальнага прарока, пры якім Беларусь нарэшце «займе свой пачэсны пасад між народамі», то ў чарговым рамане ўсё скіравана на пагібель і пакаранне чалавека за спробу яго з'яўлення ў гэты свет для годнага жыцця...

«Пазл» збіраецца Гапеевым з усяго грамадска-сацыяльнага і ўласна чалавечага негатыву сучаснай беларускай рэчаіснасці. З такіх недасканалых, хваравітых, папсаваных, скрыўленых ладам жыцця неадпаведных частак людскога існавання наўрад ці можна скласці адзіны выверааны пазл жыцця... Здавалася б. Аднак аўтар спрабуе... І што ў рэшце рэшт можна скласці з асобных недаладных чалавечых жыццяў? Проста людскóе ўсё ж ці, можа, усё ж — людскае?..

Трэба зазначыць, што ў рамане вельмі відочна паказана карумпаванасць (на сваім адпаведным узроўні, канечне) усёй правінцыйнай раённай вертыкалі...

«Слухай, от ты скажы, Лёш... Бляха, ім жа там, у ваенкамаце, от усяго адзін раз алоўкам чыркнуць — а некаму як жыццё перакрэсліць. І галоўнае ж во: якая розніца ваенкаму ці гэтаму старшыні, хто пойдзе — я ці нехта іншы? Хапае ж сёння запасу. Няма розніцы! А ты тут цэлую схему прыдумвай, каб жыць па-чалавечы.»

Арыгінальна ўведзены ў структуру тэксту і не апошні адмоўны герой рамана — клешч, які па волі аўтара таксама выконвае сваю карную функцыю.

«Клешч чакаў. Для яго не існавала часу — і яму было лёгка пераносіць гэтае чаканне свежай крыві, якое расцягнулася ўжо на многія гады. Клешч нічога не ведаў аб законах жыцця свайго арганізма, якія нязмольна адлічылі гэтую вясну, як апошнюю ў яго жыцці — чарговай зімы ён не здолеў бы перажыць, не насмактаўшыся крыві. <...> Клешч не спяшаўся, ён выбіраў момант, кіруючыся пачуццём маленькага драпежніка ў засадзе. На нейкую секунду гарачы шар рэзка апусціўся ўніз («эх, добра мы сюды зайшлі, і паляжаць можна!»). Клешч скочыў. Валасы былі густыя. І ён стаў прабірацца туды, дзе зззяла цяпло, дзе пульсавала блізка пад скурай гарачая вена.»

Што праўда, як на маё чытацкае вока, у тэксце зашмат візуальна заўважных сюжэтных схем, якія мусова зводзяцца ў адно цэлае (ці не адсюль спадзевы на канчатковае складанне пазла). Але з цікавасцю пачытаўшы таленавіта выпісаныя фрагменты рамана, усё ж будзем чакаць поўнага тэксту, які, відаць па ўсім, складзецца ў кніжны пазл.

У аб'ёмнай публікацыі вершаў юбіляра **Валеры Дубоўскага** даволі часта прабіваюцца высокія ўзоры паэтычнага мыслярства (і мастацтва). Яго нацыянальныя вобразы, угрунтаваныя на тутэйшым жыцці, змушаюць да роздуму над сутнасцю айчыннага быцця і схіляюць да метафарычных асацыяцый, як прамінулага, так і сучаснага чалавечага суіснавання ў свеце. Віншуем, як кажуць, і зычым здароўя ды творчага плёну. Але ўслухайцеся ў яго голас:

Марудна, марудна
Крадзецца па космасе час.
Імкліва, імкліва
Імгненні збягаюць ад нас.
Няспыннай, няспыннай
Мая падаецца хада.
Нясплыўнай, нясплыўнай
Бывае толькі вада.

На першы погляд, лёгка, часам неардынарна, зрэдку назіральна і павучальна, а найчасцей глыбока і захапляльна чытаюцца літаратурныя запісы, названыя аўтарам «рызыкнкавай мурокай», — і гэты аўтар **Аксана Спрынчан.** Ну вось хоць бы такая нататка: *«Калега апавядае, як напрыканцы 90-х гадоў быў на вечарыне, прысвечанай Яўгеніі Янішчыц. На яе завітаў падпіты Анатоль Сыс, і калі яму далі слова, чытаў свае вершы непаўторна, крычаў, плакаў, кленчыў, падскокваў, лягаў на падлогу. Школьнікі, прысутныя на вечарыне, былі ў захапленні.*

— А хто вам выступаў? — не магла не пацікавіцца я.

— Ты думаеш, я памятаю? Гэта ж было ў мінулым стагоддзі».

Валерыя Кустава выступае з паэтычнай нізкай «Усміхацца праз боль прыгожа...» Арыгінальныя разняволеныя вершы з эратычнай падсветкай трымаюць чытача, асабліва мужчынскага полу, у стане своеасаблівага ўзрушэння... Што праўда, сям-там высокая эмацыйна-экспрэсіўная танальнасць міжволі выштурхоўвае вонкі неарганічную зместу метафара-вулканічную пароду... Не зважаючы на тое, публікацыя запамінальная.

Гэтага болю ёй хопіць надоўга —
яго можна, як спецыі з Персіі,
дадаваць у баршчы, успаміны і вершы,
на вострыя ножыка,
самую дробку.
...Так феерычна, натхнёна-ўздымальна
ён расчытваў усмешак яе манускрыпты,
рассоўваў каленкі сваім
дыханнем,
нібыта фіранкі ў новыя рытмы.

Драматычны аповед **Таццяны Будовіч** «Аляксандра» па сваім змесце драматычны, хоць і напісаны пункцірнымі штрыхамі памяці родных ёй людзей. Бо тэкст гэты і ёсць, як зазначае аўтарка, «непрыдуманай гісторыяй». Напісанае выклікае спагаду і захапленне высокімі пачуццямі нашых папярэднікаў.

Па-свойму прыцягвае ўвагу цыкл лірычных вершаў *Ірыны Мацкевіч.* Адчуваецца, што вызначэнне такога пачуцця, як каханне, усё ж лепш паддаецца паэтычнай, чым матэматычнай логіцы.

Я па сабе сапраўдны жнец
хвілін узнёслых. Снопам цяжкім
яны збяруцца пад канец,
каб апынуцца хлебнай бражкай.
І водар тых хвілін хмяльных,
калі піла іх з асалодай,
непараўнальны да зямных
маркотных дзён. Ён пахне мёдам...

Змаганне з процьмай слоў за адзіна-сутнаснае слова — як пошук згубленага і магчымага ўнутры свайго духоўнага свету... Неяк так я вызначыў бы і ахарактарызаваў нізку вершаў дэбютанткі «Дзеяслова» **Галіны Сіўчук.** Непераадольная хэнць усё асягнуць звыш-зліш-і-над (скарысць творчую вяршыню)... Але нават у паэзіі ўяўленае надоўга не затрымаеш. І ўсё ж вымога адмысловых змыслаў і вобразаў таленавітай паэткі заваражвае і змушае верыць у яе высокамастацкі будучы плён.

мне не высніць спакой без цябе
мне начэй не выспаць
мне чуваць пераспевы жыцця ў маладым трысці
гэта я спакушаю найлепшую ў свеце выспу
непаўторным сусветам са слоў
ува мне прарасці

Часопіс друкуе вершы ўдзельнікаў першага пленэру Таццяны Сапач, што адбыўся мінулым летам у вёсцы Маркава на Маладзечаншчыне. Сярод аўтараў: **Н. Кудасава, П. Астравух, Н. Лістота, Т. Нядбай, Н. Шакунова, А. Ярош-Камінская.**

Прымае віншаванні з юбілеем вядомы пісьменнік **Анатоль Бутэвіч.** З гэтай нагоды часопіс публікуе аб'ёмную навелу *Элізы Ажэшкі* «Афіцэр» у ягоным перакладзе. Гэта літаратурна-мастацкі погляд польскай пісьменніцы і нашай зямлячкі на падзеі паўстання 1863 года, што адбываліся на Палессі, пра ўзаемаадносіны мясцовых жыхароў гэтага краю з расійскімі жаўнерамі.

З перакладаў яшчэ — медытацыйна-мысленчыя вершы нарвежскай паэткі **Лінды Клакен** у перастварэннях Вольгі Гапеевай.

белае пакрыва па-над паркам
птушкі шлюць цьмяныя паведамленні
адна адной праз
хмызняк
я не разумею тое
што разумее прырода
ўжо мільёны гадоў

Друкуецца ў перакладах Віктара Гардзея і з адмысловым уступным словам Анатоля Трафімчыка паэма польскамоўнага паэта **Артура Бартэльса,** з дня нараджэння якога сёлета спаўняецца 200 гадоў, што выклікала ў мяне асаблівую ўвагу. Справа ў тым, што і Гардзей, і Трафімчык, і я мелі шчасце нарадзіцца ў блізкіх ад Дзяніскавіч мясцінах. На сваю беларускую крэўнасць аўтар згадвае ў фінале паэмы:

З сасны, што ўзрасла на Ізбіску,
Скуль вызнаў сірочыя дні,
Шкада, не зрабілі калыску,
А так і згарыць у агні.
Ужо з тае хвоі нічога
Не ўзяць для магілкі маёй,
Развітваюся ў імя Бога
З палескаю крэўнай сям'ёй.

Займальна і дасведчана разгортвае жыццёвы і літаратурны лёс двух «апальных» беларускіх паэтаў — Масея Сяднёва і Тодара Лебяды — слонімскі літаратуразнаўца **Сяргей Чыгрын.**

Працягваецца прыцягальная гісторыя жыцця і дзейнасці **Юліі Бібілы** праз публікацыю яе ўспамінаў, падрыхтаваных А. Лісам і Т. Кекелевай.

Выдатны наш паэт з Беласточчыны **Ян Чыквін** у гутарцы з Наталляй Гардзіенка распавядае пра тамашні літаратурны працэс, а таксама пра сябе і сваё бачанне творчай і нацыянальнай дзейнасці (змагання-згасання) беларускамоўных суайчыннікаў у гэтым «забраным краі»...

Цёплы, душэўна-таварыскі ўспамін пра заўчасна адышоўшага з гэтага свету свайго калегу, літаратуразнаўца і крытыка Ігара Жука напісаў **Алесь Бельскі.** Англійскі лорд беларускай літаратуры **Арнольд Макмілін** публікуе артыкул пра паэтку Вальжыну Морт. **Леанід Галубовіч** рэцэнзуе новую кнігу Віктара Карамазава «Пад крыжам». З цікавасцю чытаюцца своеасаблівыя літаратуразнаўчыя дзённікавыя нататкі крытыка **Паўла Абрамовіча.** Яны адназначна асвяжаюць і дадаюць вістаў адпаведнаму часопіснаму раздзелу. Завяршае публікацыі рубрыка **«Дзеяпіс»** з анатацыямі новых кніжак.

Прыемнага вам чытання на летніх вакацыях.

ЛеГал

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 7 (143) | 20 ліпеня 2018 | № 27 (590) Новы час

Дзень нараджэння



Оскар ЎАЙЛД

Надышоў дзень нараджэння інфанты. Ёй акурат споўнілася дванаццаць гадоў, і ў садах палаца ярка свяціла сонца.

Нягледзячы на тое, што яна была сапраўднай прынцэсай і гішпанскай інфантай, у яе, як і ў дзяцей звычайных беднякоў, дзень нараджэння здараўся толькі раз на год, а таму для ўсёй краіны было надзвычай важна, каб гэта быў напраўду цудоўны дзень. Так яно і атрымалася. Высокія цюльпаны з рознакаляровымі пялёсткамі роўна трымаліся на сцяблінах, як стройныя шыхты жаўнераў, і дзёрзка пазіралі з травы на ружы, і казалі: «Мы такія ж непаўторныя, як і вы». Пурпуровыя матылькі з залатым пылком на крыльцах лёталі там і тут, па чарзе наведваючы кожную кветку, маленькія яшчаркі павыпаўзалі з расколінаў у сцяне і грэліся ў асляпляльным святле, а гранатавыя плады трэскаліся ад гарачыні і агалялі свае акрываўленыя чырвоныя сэрцы. Навят бледна-жоўтыя лімоны, якіх багата вісела на падломленых галінах уздоўж цяністых галерэяў, здавалася, пазычылі сабе ў зіхоткага сонечнага прамення больш яркі колер, а магноліі раскрывалі свае шыкоўныя, вытачаныя са слановай косткі круглыя кветкі і поўнілі паветра цяжкім салодкім водарам.

Сама маленькая прынцэса прагульвалася туды-сюды па тэрасе і разам са світай гуляла ў хованкі сярод каменных вазаў і старых, паросллых імхом статуй. У звычайныя дні ёй дазвалялі гуляць толькі з дзецьмі такога ж высокага паходжання, як яна сама, а таму ёй даводзілася быць адной, аднак на дзень нараджэння рабілася выключэнне: згодна з загадам караля яна магла запрасіць усіх сваіх юных сяброў, якіх хацела бачыць і з якімі хацела бавіць час. Колькі вытанчанай велічы было ў гэтых гішпанскіх дзецях, калі яны паволі крочылі на свята, хлопчыкі — у капелюшах, багата ўпрыгожаных пёрамі, і кароткіх плашчах, што трапяталі ад ветру, дзяўчаткі — прытрымліваючы доўгія шлейфы парчовых сукенак і прыкрываючы груваскімі (чорнымі са срэбным) веерамі вочы ад сонца. Але найпрыгажэйшай сярод іх была інфанта, апранутая з самым вытанчаным густам паводле ўсіх мудрагелістых патрабаванняў тагачаснай моды. Сукенка яе была з шэрага атласу, падол і рукавы з вялізнымі буфамі шчодра вышытыя серабром, а тугі гарсэт усеяны нізкамі прыгожых перлінаў. Калі яна ішла, з-пад яе ўбрання вызіралі два дробненькія мяккія пантофлікі з вялікімі ружовымі разеткамі. Яе вялікі веер з газу быў перламутрава-ружовы, а ў яе валасы, што шорстка аблямоўвалі маленькі бледны твар, нібы вянец з пацьмелага золата, упрялі прыгожую белую ружу.

З палацавага акна за імі сумна і меланхалічна назіраў кароль. За спінай караля стаяў яго брат, дон Педра Арагонскі, якога кароль ненавідзеў, а побач сядзеў яго духоўнік, вялікі інквізітар Гранады. Сумнейшы, чым звычайна, быў у гэты дзень кароль, бо, сочачы за інфантай, якая з дзіцячай сур'ёзнасцю раскланьвалася з прыдворнымі ці, схаваўшыся за веерам, смяецца са змрочнай герцагіні Альбукеркскай, сваёй нязменнай спадарожніцы, ён думаў пра юную каралеву, яе маці, якая, здавалася, зусім нядаўна прыбыла з вясёлай французскай зямлі і завяла сярод панурай раскошы гішпанскага двара — памерла роўна праз шэсць месяцаў пасля нараджэння дзіцяці, не паспеўшы пабачыць, як другі раз зацвітае ў садзе міндаль, і не сарваўшы другі раз пладоў старога вузлаватага фігавага дрэва, што расло ў сярэдзіне парослага цяпер травой двара. Такім вялікім было яго каханне, што ён не дазволіў магіле адабраць у яго жонку. Маўрытанскі лекар забальзамаваў яе і ўратаваў гэтым сабе жыццё, бо, кажуць, святая інквізіцыя ўжо прысудзіла яго да смерці за ерась і падазрэнне ў магічных практыкаваннях, і цяпер цела каралевы ляжала на засланым габеленамі ложы ў палацавай капліцы з чорнага мармуру, апранутае ў тыя самыя строі, у якія яе ўбралі манахі тым ветраным сакавіцкім днём каля дванаццаці гадоў таму. Раз у месяц кароль, захутаўшыся ў жалобны плашч і ўзяўшы патайны ліхтар, прыходзіў да яе, уклянчваў побач і клікаў: «Mi reina! Mi reina!», — у дзікай агоніі пакуты ловячы бледную, упрыгожаную пярсцёнкамі руку, спрабуючы шалёнымі пацалункамі абудзіць халодны нафарбаваны твар і парушаючы часам этыкет, які ў Гішпаніі кіруе кожным крокам чалавека і ўсталёўвае нават межы каралеўскага гора.

Сёння яму здалося, што ён зноў бачыць яе такой, якой убачыў першы раз у замку Фантэнбло, калі яму было ўсяго пятнаццаць, а ёй — яшчэ менш. З гэтай нагоды іх у прысутнасці караля Францыі і ўсяго двара афіцыйна заручыў папскі нунцый, і жаніх вярнуўся ў Эскурыял, забраўшы з сабой пасмачку залацістых валасоў і памяць пра дзіцячыя вусны, што прыціснуліся да яго рукі, калі ён сядаў у экіпаж. Потым у Бургасе, маленькім гарадку на мяжы паміж дзвюма краінамі, адбылося паспешлівае вяселле, і натоўп гасцей паехаў у Мадрыд, дзе адслужылі традыцыйную месу ў царкве La Atocha і зладзілі больш урачыстае, чым звычайна, аўтадафэ, дзеля якога свецкім уладам перадалі для спальвання каля трохсот ерэтыкоў, у тым ліку нямала ангельцаў.

Ён, безумоўна, шалёна яе кахаў — на бяду, як думалі многія, сваёй краіне, бо акурат ішла вайна з Англіяй за валоданне імперыяй Новага свету. Ён не дазваляў ёй знікаць з поля яго зроку, забыў дзеля яе, ці зрабіў выгляд, што забыў, усе важныя справы дзяржавы, і з той жахлівай слепатой, якой каханне раніць сваіх слугаў, не заўважаў, што вытанчаная цырымоннасць, якая мусіла ёй дагадзіць, толькі абвастрае яе дзіўную немач. Калі яна памерла, на некаторы час ён ледзь не звар'яцеў. Няма сумневу, што ён афіцыйна адмовіўся б ад стальца і сышоў бы ў вялікі трапісцкі манастыр у Гранадзе, у якім намінальна лічыўся настаяцелем, калі б не боязь пакінуць маленькую інфанту на міласць свайго брата, чыя жорсткасць была надзвычайнай нават для Гішпаніі: хадзілі чуткі, што ён прычыніўся да смерці каралевы, падарыўшы ёй з нагоды яе візіту ў арагонскі замак пару атручаных пальчатак. Нават калі ў краіне скончылася трохгадовая жалоба, якая згодна з каралеўскім загадам была абвешчаная ва ўсіх гішпанскіх уладаннях, ён не дазваляў міністрам нават пачынаць размову пра новы шлюб, і калі сам імператар прапанаваў яму руку сваёй пляменніцы, чароўнай эрцгерцагіні Багемскай, ён папрасіў паслоў перадаць уладару, што кароль Гішпаніі ўжо павянчаўся са Скрухай, і хоць сужаніца яго бясплодная, ён аддае ёй перавагу перад Красой. Адказ гэты каштаваў яму багатых нідэрландскіх правінцыяў, якія, падбухтораныя імператарам, неўзабаве выбухнулі паўстаннем пад кіраўніцтвам нейкіх фанатыкаў-кальвіністаў.

Здавалася, сёння, калі ён назіраў за інфантай, што гуляла на тэрасе, да яго вярнулася ўсё яго шлюбнае жыццё з яго жарснымі, палымянымі радасцямі і жахлівай агоніяй нечаканага канца. У дачцэ была ўся мілая дзёрзкасць яе маці, яе манера ўстрэсваць галавой, яе ганарлівы выгін цудоўных вуснаў, яе чароўная ўсмешка — сапраўды, vrai sourire de France, — калі яна час ад часу падымала вочы на акно ці падавала маленькую ручку велічнаму гішпанскаму джэнтльмену для пацалунка. Але рэзкі дзіцячы смех раздражняў яго вуха, яркае і бязлітаснае сонечнае святло кпіла з яго гора, а ледзь улоўны водар дзівосных духмяных рэчываў, падобных да тых, што выкарыстоўваюцца пры бальзамаванні, пранізваў — ці гэта толькі здавалася? — празрыстае ранішняе паветра. Кароль схаваў рукамі твар, і калі інфанта чарговы раз зірнула на акно, гардзіны былі ўжо апушчаныя, а кароль знік.

Інфанта расчараваная скрывілася і паціснула плячыма: дзень яе нараджэння ён, безумоўна, павінен быў правесці з ёй. Навошта яму гэтыя дурныя дзяржаўныя справы? А можа, ён адправіўся ў тую змрочную капліцу, дзе заўсёды гараць свечкі і куды ёй ніколі не дазвалялі ўвайсці? Як жа гэта бязглузда, калі вакол столькі сонечнага святла і ўсе такія шчаслівыя! Можа, ён яшчэ прапусціць і гульнёвы бой быкоў, на які ўжо клічуць трубы, не кажучы пра лялечнае выступленне ды іншыя цудоўныя забавы. Яе дзядзька і вялікі інквізітар нашмат разумнейшыя. Яны выйшлі на тэрасу і вельмі міла яе павіншавалі. Таму яна страсянула чароўнай галоўкай і, узяўшы дона Педра пад руку, марудна спусцілася з прыступак і пайшла да доўгага шатра з пурпуровага ядвабу, які паставілі ў канцы сада, а астатнія дзеці рушылі за ёй у адпаведнасці са знатнасцю сваіх сем'яў: тыя, у каго было больш імёнаў, ішлі першымі.

Насустрач ёй выйшла працэсія высакародных хлопчыкаў у дзівосных касцюмах тарэадораў, і малады граф Цьера-Нуэва, неверагодна прыгожы юнак гадоў чатырнаццаці, з усёй грацыёзнасцю прыроджанага ідальга і гішпанскага гранда зняў перад ёй капялюш і ўрачыста падвёў да маленькага пазалочанага крэсла са слановае косткі, што стаяла на ўзвышэнні ля арэны. Дзеці сабраліся вакол яе, абмахваючыся цяжкімі веерамі і перашэптваючыся, а дон Педра і вялікі інквізітар, смеючыся, сталі ля ўвахода. Нават герцагіня — яе называлі Camerera-Mayor, — хударлявая жанчына з грубымі рысамі твару і жоўтым гафрыраваным каўняром, не выглядала сёння такой раздражнёнай, як звычайна, і нешта падобнае да халоднай усмешкі слізгала па яе маршчыністым твары і скрывляла тонкія бяскроўныя вусны.


Бой быкоў быў, несумненна, цудоўны і нашмат лепшы, думала інфанта, чым сапраўдная карыда, на якую яе вазілі ў Севілью з нагоды візіту герцага Пармскага да яе бацькі. Адны хлопчыкі гарцавалі на цацачных конях з багатымі гунькамі, размахваючы доўгімі коп'ямі, упрыгожанымі яркімі стракатымі стужкамі, іншыя бегалі перад быком, дражнячы яго пунсовымі плашчамі і лёгка пераскокваючы цераз бар'ер, калі бык кідаўся на іх; што ж да самога быка, то ён выглядаў зусім як жывы, хаця і быў зроблены з лазы і абцягнуты скурай, і часам пачынаў бегаць вакол арэны на дзьвюх нагах, чаго ніколі не зрабіў бы бык сапраўдны. Біўся ён таксама неверагодна, а таму дзеці так захапіліся, што пазалазілі на лавы, замахалі карункавымі насоўкамі і закрычалі: «Брава, toro! Брава, toro!» – з такім пачуццём, нібыта былі дарослымі. Урэшце пасля працяглай бойкі, падчас якой бык праціў рагамі некалькіх цацачных коней і скінуў на зямлю іх вершнікаў, юны граф Цьера-Нуэва паставіў быка на калені і, атрымаўшы ад інфанты дазвол нанесці яму смяротны ўдар, праціў яго шыю драўляным мячом з такой лютасцю, што галава жывёліны адскочыла, і перад вачыма гледачоў з'явіўся насмешлівы твар маладога мсье дэ Ларэна, сына французскага пасла ў Мадрыдзе.

Пад бурныя воплескі арэна была прыбраная, два пажымаўры ў жоўтых з чорным ліўрэях адцягнулі целы мёртвых цацачных скакуноў, і пасля кароткага перапынку, падчас якога французскі гімнаст танчыў на канаце, італьянскія лялечнікі прадставілі на сцэне спецыяльна пабудаванага маленькага тэатрыка напаўкласічную трагедыю «Сафанісба». Гралі яны так добра і ўсе іх рухі былі так дасканала выверанымі, што пры канцы п'есы вочы інфанты затуманіліся слязьмі. Некаторыя дзеці ўвогуле расплакаліся, і давялося суцяшаць іх цукеркамі, нават вялікі інквізітар так усхваляваўся, што не вытрымаў і сказаў дону Педра, што яму невыносна глядзець на гэтых простых, зробленых з дрэва і каляровага воску лялек на дроце, якія церпяць такія нягоды і перажываюць такія няшчасці.

Потым выступаў афрыканскі фокуснік, які прынёс з сабой вялікі пляскі кош, пакрыты чырвонай тканінай, паставіў яго ў сярэдзіне сцэны, выцягнуў з турбана дзіўнаватую трысняговую дудку і пачаў на ёй граць. Праз некалькі імгненняў тканіна пачала рухацца, і калі дудка загучала пранізлівей, дзве зялёныя з залатым змейкі паднялі з-пад яе клінападобныя галовы і марудна загайдаліся з боку ў бок у такт музыцы, як гайдаюцца пад вадой расліны. Дзеці, аднак, напужаліся, убачыўшы іх плямістыя клабукі і хуткія джалы-язычкі, і супакоіліся толькі тады, калі фокуснік проста на іх вачах вырасціў на пяску маленечкае апельсінавае дрэва, усыпанае прыгожымі белымі кветкамі і гронкамі сапраўдных пладоў, калі ж ён узяў у дачкі маркіза дэ Лас-Торэс веер і ператварыў яго ў блакітную птушку, якая тут жа пачала лётаць па павільёне і спяваць, іх захапленню і радасці не было межаў. Урачысты менуэт, які выканалі потым два хлопчыкі-танцоўшчыкі з царквы Нуэстра Сеньёра Дэль Пілар, таксама быў чароўны. Інфанта яшчэ ніколі не бачыла гэтай цудоўнай цырымоніі, што ладзіцца кожны год у травеньскі час у гонар Божай Маці перад яе высокім алтаром, бо ніхто з каралеўскай сям'і ніколі не бываў у вялікім саборы ў Сарагосе з тых часоў, калі шалёны святар, падкуплены, як мяркуецца, Елізаветай Ангельскай, паспрабаваў прычасціць атручанай аплаткай прынца Астурыйскага. Яна толькі чула пра «Танец Божай Маці», як яго называлі, і, відовішча гэтае, несумненна, было шыкоўнае. Хлопчыкі былі ўбраныя ў старадаўнія прыдворныя строі з белага аксаміту і незвычайныя трохвуголкі, упрыгожаныя па краях серабром і ўвянчаныя вялікімі стравусавымі пёрамі, і калі юнакі рухаліся ў танцы, асвечаныя сонечным святлом, сляпучая белата іх касцюмаў яшчэ больш адцянялася смуглявымі тварамі і доўгімі чорнымі валасамі. Усіх зачаравала велічная годнасць, з якой яны выконвалі складаныя фігуры танцу, і дасканалая вытанчанасць марудных рухаў і паважных паклонаў, і калі хлопчыкі спыніліся і знялі перад інфантай капелюшы, яна адказала на іх паклон з надзвычайнай прыязнасцю, паабяцаўшы сабе адправіць да алтара царквы Божай Маці Дэль Пілар вялікую васковую свечку на знак удзячнасці за прыемнасць.

Потым на арэне з'явілася група прыгожых егіпцян — так у тыя часы называлі цыганоў, — якія, падціснуўшы пад сябе ногі, селі колам і пачалі ціха граць на цытрах, пагойдваючыся ў такт

інфанты



мелодыі і ледзь чутна, цішэй нават, чым дыхалі, напяваючы сумную і летуценную песеньку. Убачыўшы дона Педра, яны нахмурыліся, а нехта нават і спалохаўся, бо ўсяго два тыдні таму ён павесіў двух з іх племені за чарадзейства на рынкавай плошчы Севільі, але цудоўная інфанта, што адкінулася трошкі назад і пазірала на іх з-пад веера вялікімі блакітнымі вачыма, зусім іх заваражыла, — цыганы былі ўпэўненыя, што такая красуня нікога не зможа пакрыўдзіць. А таму яны працягвалі граць — вельмі пяшчотна, ледзь-ледзь кранаючыся струнаў цытраў доўгімі вострымі пазногцямі і ківаючы галовамі, нібыта зараз праваляцца ў сон. Раптам з такім пранізлівым крыкам, што дзеці скалануліся, а дон Педра схапіўся за агатавы тронак кінжала, яны ўскочылі на ногі і шалёна закружыліся па сцэне, б'ючы ў бубны і распяваючы дзікую любоўную песню на сваёй дзіўнай гартаннай мове. Гэтак жа нечакана праз некаторы час яны зноў кінуліся на зямлю і знерухомелі — глухі звон цытраў быў адзіным гукам, што парушаў цішыню. Паўтарыўшы гэта некалькі разоў, яны на імгненне зніклі і потым вярнуліся, ведучы на ланцугу касматага бурага мядзведзя, а на плячах несучы маленькіх варварыйскіх малпачак. Мядзведзь з надзвычайнай сур'ёзнасцю стаў на галаву, а маршчыністыя малпачкі пачалі з дапамогай двух цыганятаў, відаць, іх гаспадароў, забаўляць гледачоў разнастайнымі трукамі: біцца на маленечкіх мячах, страляць з ружжаў і праводзіць страявыя вучэнні — рыхтык як прыватная варта караля. У выніку цыганы мелі вялікі поспех.

Але найцікавейшай часткай ранішніх забаваў былі, без сумневу, танцы маленькага карліка. Калі ён уваліўся на арэну, кульгаючы на крывых нагах і махаючы з боку ў бок вялікай звыродлівай галавой, дзеці закрычалі ад радасці, а сама інфанта смяялася так, што герцагіня мусіла ёй нагадаць, што хаця ў Гішпаніі дочкі каралёў не раз плакалі ў прысутнасці роўных ім па званні, яшчэ ніводная прынцэса каралеўскай крыві не весялілася так перад асобамі, ніжэйшымі за яе паводле паходжання. Але карлік і насамрэч быў невераготны: такой дзівоснай пачваркі не бачылі нават пры гішпанскім двары, добра вядомым вытанчанай цікавасцю да ўсяго жахлівага. Зрэшты, гэта быў першы яго выступ. Два гранды, што за дзень да таго палявалі ў аддаленай частцы вялікага пробкавага лесу, які атачаў горад, знайшлі яго, свабоднага, у нетрах і даставілі ў палац як падарунак для інфанты. Бацька карліка, бедны вугальшчык, быў рады пазбыцца такога звыродлівага і бескарыснага сына. Самым забаўным у карліку было тое, што ён зусім не ўсведамляў, які ён насамрэч недарэчны. Больш за тое, ён выглядаў задаволеным і вясёлым. Калі дзеці смяяліся, ён смяяўся гэтак жа адкрыта і радасна, як яны, а пры канцы кожнага танцу ён пацешна кланяўся ўсім гледачам, усміхаючыся і ківаючы так, нібыта ён быў адным з іх, а не маленькім няшчасным стварэннем, якое прырода, будучы ў добрым гуморы, стварыла людзям на забаву. Што да інфанты, дык яна дарэшты яго зачаравала. Ён не зводзіў з яе вачэй і, здавалася, танчыў для яе адной, і калі ў канцы выступу інфанта ўспомніла, як знатныя прыдворныя дамы кідалі букеты Кафарэлі, знакамітаму італьянскаму дысканту, якога Папа Рымскі прыслаў у Рым з уласнай капэлы, спадзеючыся вылечыць караля з дапамогай салодкагалосага спевака ад меланхоліі, яна выцягнула з валасоў прыгожую белую ружу і часткова дзеля жарту, часткова дзеля таго, каб падражніць герцагіню, з найсаладзейшай усмешкай кінула яе на арэну. Карлік да гэтага падарунка паставіўся надзвычай урачыста: ён прыціснуў кветку да шурпатых вуснаў, паклаў руку на сэрца і апусціўся перад інфантай на адно калена, пасміхаючыся ад вуха да вуха, і яго маленькія яркія вочкі ззялі ад асалоды.

Гэта канчаткова пазбавіла інфанту ад рэштак сур'ёзнасці, і яна яшчэ доўга смяялася пасля таго, як карлік выбег з арэны, а пасля папрасіла дзядзьку, каб танец абавязкова паўтарылі. Аднак герцагіня, спаслаўшыся на занадта гарачае сонца, вырашыла, што яе высокасці трэба цяпер жа вяртацца ў палац, дзе для яе ўжо падрыхтавалі шыкоўнае баляванне, у тым ліку сапраўдны імянінны торт з ініцыяламі інфанты, вырабленымі з пафарбаванага цукру, і міленькім срэбным сцяжком на самай верхавіне. А таму інфанта з усёй годнасцю паднялася, наказаўшы, каб маленькі карлік танчыў перад ёй яшчэ раз пасля сіесты, ад душы падзякавала юнаму графу Цьера-Нуэва за цёплы прыём і адправілася ў свае апартаменты ў суправаджэнні дзяцей, якія ішлі ў тым самым парадку, што і па дарозе сюды.

Калі карлік пачуў, што ён будзе танчыць перад інфантай яшчэ раз, прычым на яе ўласнае жаданне, ён так узрадаваўся, што выбег у сад і пачаў з недарэчным захапленнем і асалодай цалаваць белую ружу, радуючыся самым няўклюдным і нязграбным чынам.

Кветак страшэнна абурыла такое ўварванне ў іх прыгожы дом, убачыўшы ж, як ён скача туды-сюды па сцяжынках, пацешна размахваючы над галавой рукамі, яны больш не маглі стрымліваць сваіх пачуццяў.

— Ён занадта звыродлівы, каб гуляць побач з намі, — усклікнуў цюльпан.

— Хай вып'е макавага соку і засне на тысячу гадоў! — прамовілі вялікія пунсовыя лілеі, запалаўшы ад гневу яшчэ мацней.

— Жах, чысты жах! — пракрычаў кактус. — Ён жа зусім скручаны і каржакаваты, а памер яго галавы ўвогуле не адпавядае даўжыні яго ног! Праз яго ў мяне ўсе калючкі дыбарам, і калі ён толькі да мяне падыдзе, я яго пакалю!

— А ў яго, між іншага, адна з маіх найлепшых кветак, — абвясціў белы ружовы куст. — Сёння ранкам я сам даў яе інфанце ў падарунак на дзень нараджэння, і ён яе скраў! — і тут куст пачаў з усяе моцы крычаць. — Злодзей, злодзей, злодзей!

Нават чырвоныя герані, якія не часта дазваляюць сабе паважнічаць, бо і самі маюць нямала бедных сваякоў, зморшчыліся, убачыўшы карліка, ад агіды, і калі фіялкі сціпла зазначылі, што хоць ён і зусім непрыгожы, віны яго тут няма, герані з пэўнай доляй справядлівасці запярэчылі, што ў гэтым уся і бяда і што няма ніводнай прычыны захапляцца кімсьці, калі ён невылечны. Папраўдзе кажучы, некаторыя з фіялак і самі адчувалі, што карлік амаль выстаўляе сваю брыдкасць напаказ і што ён выказаў бы нашмат больш густу, калі б выглядаў маркотным ці прынамсі задуменным замест таго, каб весела скакаць і вырабляць такія бязглуздыя і дурныя штукі.

Што да старога сонечнага гадзінніка, надзвычай цікавага суб'екта, які аднойчы падказаў час не больш ні менш як самому імператару Карлу V, то яго з'яўленне карліка так агаломшыла, што ён ледзь не забыўся адзначыць цэлыя дзве хвіліны доўгім ценявым пальцам і, не стрымаўшыся, паведаміў малочна-беламу паўліну, які акурат прымаў на балюстрадзе сонечныя ванны, што дзеці каралёў заўсёды рабіліся каралямі, а дзеці вугальшчыкаў — вугальшчыкамі, і бязглузда спадзявацца на нешта іншае. Паўлін з гэтым сцверджаннем цалкам пагадзіўся і пракрычаў «Так і ёсць, так і ёсць!» такім гучным і рэзкім голасам, што залатыя рыбкі, якія жылі ў басейне фантана, што пырскаўся прахалоднай вадой, высунулі з вады галовы і запыталі ў вялізнага каменнага Трытона, што б усё гэта магло значыць.

Але птушкам карлік чамусьці падабаўся. Яны часта бачылі яго ў лесе, калі ён, нібы лясны дух, танчыў, ганяючыся за лісцем, што падала з дрэваў, ці скручваўся ў лагчынцы між каранёў старога дуба, дзелячыся з вавёркамі сабранымі арэхамі. На яго агіднасць увагі яны не звярталі. Бо нават салавей, які начамі так салодка спяваў у апельсінавых гаях, што нават месяц часам нахіляўся яго паслухаць, выглядаў не такім ужо прыгажуном, да таго ж карлік ставіўся да птушак з вялікай дабрынёй, ніколі не забываў пра іх у страшэнна марозную зіму, калі на дрэвах не застаецца ягад, зямля робіцца цвёрдай, як камень, а ваўкі падыходзяць да самых гарадскіх брамаў, шукаючы ежы, і заўсёды аддаваў ім крошкі ад акрайца чорнага хлеба і дзяліўся з імі сняданкам, якім бы бедным ён ні быў.

А таму яны лёталі цяпер вакол, злёгку кранаючы яго твар крыламі і шчабечучы паміж сабой, і маленькі карлік так радаваўся, што не змог стрымацца і паказаў ім прыгожую белую ружу, якую дала яму сама інфанта, бо яна яго кахае…

Птушкі не разумелі ніводнага яго слова, але якая розніца, яны проста засяроджана нахілілі галовы набок, а гэта зусім не горш, чым разумець, ды яшчэ і нашмат лягчэй.

Яшчаркі таксама моцна ім захапіліся, і калі ён, набегаўшыся, стаміўся і паваліўся на траву адпачыць, яны пачалі ля яго весела мітусіцца і з усіх сіл спрабавалі яго забавіць.

— Не ўсім жа быць такімі прыгожымі, як яшчаркі, — крычалі яны. — Гэтага было б зашмат! І хаця гэта гучыць даволі бязглузда, насамрэч не такі ўжо ён і брыдкі, калі, безумоўна, заплюшчыць вочы і не глядзець у яго бок.

Яшчаркі па прыродзе сваёй былі сапраўднымі філосафамі, і часта, калі ім не было чаго рабіць ці калі залева перашкаджала ім выйсці на вуліцу, яны гадзінамі сядзелі на адным месцы і думалі.

Кветак, аднак, паводзіны яшчарак надзвычай трывожылі, зрэшты, як і паводзіны птушак:

— Гэта сведчыць выключна пра грубасць тых, хто ўвесь час поўзае і лётае. Добра выхаваныя асобы заўсёды застаюцца на адным і тым жа месцы — так, як робім мы. Яшчэ ніхто не бачыў, каб мы скакалі туды-сюды па сцяжынках ці дзіка насіліся ў траве за стракозамі. Калі нам хочацца змяніць абстаноўку, мы клічам садоўніка, ён перасаджвае нас на іншую клумбу. Вось гэта годныя паводзіны, так і трэба. А гэтыя птушкі і яшчаркі не ўмеюць цаніць спакой, а ў птушак нават няма пастаяннага адрасу. Яны — сапраўдныя бадзягі, як тыя цыганы, і ставіцца да іх трэба адпаведна.

З гэтымі словамі кветкі фанабэрліва задралі насы і праз некаторы час з прыемнасцю адзначылі, што карлік падняўся з травы і цяпер ішоў уздоўж палацавай тэрасы.

— Няма ніякага сумневу, што яго варта было б да канца жыцця замкнуць, — сказалі кветкі. — Паглядзіце на яго гарбатую спіну і крывыя ногі! — і яны захіхікалі.

Але маленькі карлік нічога пра гэта не ведаў. Ён вельмі любіў птушак і яшчарак і думаў, што кветкі — гэта самае чароўнае, што ёсць у свеце, безумоўна, калі не лічыць інфанту, але ж яна падарыла яму прыгожую белую ружу, і яна любіла яго, а гэта зусім іншая справа! Як жа ён хацеў зноў быць з ёй! Яна б пасадзіла яго па правую руку, і ўсміхалася б яму, і ён ніколі б яе не пакінуў, а гуляў бы з ёй і навучыў бы яе безлічы цудоўных рэчаў. Бо хаця ён ніколі раней не быў у палацы, ён ведае столькі дзівосных штук! Ён умее рабіць з чароту маленечкія клеткі для конікаў і ператвараць сустаўчаты бамбук у жалейку, якую так ахвотна слухае Пан. Ён ведаў голас кожнай птушкі і мог паклікаць з вершаліны дрэва шпакоў ці з балота — чаплю. Ён адрозніваў сляды ўсіх жывёл і мог высачыць зайца па далікатных адбітках яго лап, а вепрука — па вытаптанай лістоце. Ён ведаў усе танцы вольных людзей: і шалёны восеньскі танец у чырвоных убраннях, і лёгкі танец у блакітных сандалях сярод збожжавых палёў, і зімовы танец між белых сумётаў, і танец кветак у веснавых садах. Ён ведаў, дзе гняздуюцца вяхіры, і аднойчы, калі птушкалоў злавіў у сіло парачку галубоў, сам вырасціў птушанят, пабудаваўшы для іх галубятню ў расколіне падрэзанага вяза. Яны зрабіліся зусім свойскімі, і ён кожным ранкам карміў іх з рук. Яны абавязкова ёй спадабаюцца, як і трусікі, што носяцца ў высокіх папарацях, як і сойкі з цвёрдымі пёрамі і чорнымі дзюбамі, як і вожыкі, што ўмеюць скруціцца ў калючыя шарыкі, як і вялікія мудрыя чарапахі, што марудна поўзаюць па зямлі, трасучы галовамі і абшчыпваючы зялёнае лісце. Так, ёй абавязкова трэба прыйсці да яго ў лес і пагуляць там. Ён уступіць ёй свой маленькі ложак і да самага світання будзе сядзець пад акном, каб упэўніцца, што дзікія рагачы яе не пакрыўдзяць, а кашчавыя ваўкі не падкрадуцца занадта блізка да хаціны. На досвітку ён пагрукае ў аканіцы і абудзіць яе, і яны выйдуць вонкі і будуць увесь дзень танчыць. У лесе ж насамрэч зусім не сумна. Часам на белым муле праедзе біскуп, чытаючы кнігу з малюнкамі. Часам пройдуць паляўнічыя ў зялёных аксамітных шапачках і камзолах з дубленай аленевай скуры, трымаючы на запясцях сокалаў у скураных каўпачках. У пару збору вінаграду праходзяць тут вінаградары з пурпуровымі рукамі і нагамі, у вянках з глянцавітага плюшчу, несучы бурдзюкі, з якіх капае віно, вугляпалы сядзяць уначы вакол вялізных жароўняў, назіраючы, як апальваюцца ў агні сухія бярвенні, і смажаць на прыску каштаны, а разбойнікі выходзяць з пячораў і вяселяцца разам з імі. Аднойчы ён нават бачыў прыгожую працэсію, што вілася па доўгай пыльнай дарозе да Таледа. Спераду выступалі манахі, салодка спяваючы і несучы яркія харугвы і крыжы з золата, за імі крочылі салдаты ў срэбных латах, з мушкетамі і пікамі, а сярод іх ішлі трое басаногіх людзей з

запаленымі свечкамі ў руках, у дзіўных жоўтых строях, спрэс размаляваных дзівоснымі фігуркамі. У лесе дакладна ёсць на што паглядзець, і калі яна стоміцца, ён знойдзе для яе мяккую падушку з імху ці возьме яе на рукі, бо яны ж у яго вельмі моцныя, хоць ён і ведае пра свой невысокі рост. Ён зробіць ёй каралі з чырвоных ягад пярэступу, нічым не горшых за тыя белыя ягады, што ўпрыгожваюць яе сукенку, і калі каралі ёй надакучаць, яна зможа іх выкінуць, а ён знойдзе для яе іншыя. Ён прынясе ёй чашачкі ад жалудоў, і мокрыя ад расы анемоны, і маленечкіх светлячкоў, каб яны ззялі зоркамі на бледным золаце яе валасоў.

Але дзе яна? Ён задаваў гэтае пытанне белай ружы, але не атрымліваў адказу. Здавалася, што ўвесь палац спіць, і нават на вокнах, не зачыненых аканіцамі, віселі цяжкія гардзіны, абараняючы пакоі ад святла. Ён бадзяўся вакол палаца, шукаючы, як бы зазірнуць у сярэдзіну, і ўрэшце заўважыў маленькія адасобленыя дзверы, што засталіся незамкнёнымі. Ён праслізнуў туды і апынуўся ў шыкоўнай зале, нашмат шыкоўнейшай, чым лес, бо там паўсюль было столькі пазалоты, і нават падлога была выраблена з вялікіх каляровых камянёў, выкладзеных накшталт геаметрычных фігур. Але маленькай інфанты тут не было, а былі адны белыя статуі з сумнымі пустымі вачыма і дзіўнымі ўсмешкамі, пазіраючы на яго зверху ўніз з яшмавых п'едэсталаў.

У канцы залы вісела багата вышытая гардзіна з чорнага аксаміту, усеяная сонцамі і зоркамі: гэта быў любімы ўзор караля, ды і чорны колер падабаўся яму найбольш. Можа, яна хаваецца там? У любым выпадку, трэба праверыць.

Ціхутка падабраўшыся да гардзіны, ён адсунуў яе ўбок. Не, за ёй толькі іншы пакой, прыгажэйшы, на думку карліка, за папярэдні. У ім на сценах віселі багата расшытыя зялёныя габелены з вывамі палявання — працы аднаго фламандскага майстра, які патраціў на іх сем гадоў. Калісьці гэта быў пакой Хуана Шалёнага, як называлі таго звар'яцелага караля, які так горача любіў паляванне, што ў трызненні часта спрабаваў ускочыць на высачэзнага каня, які стаяў дубка, і сцягнуць са сцяны аленя, акружанага магутнымі сабакамі, дзьмучы ў паляўнічы рог і б'ючы кінжалам бледную імклівую лань. Цяпер тут праводзіліся рады, і на стале, што стаяў у сярэдзіне пакоя, ляжалі чырвоныя партфелі міністраў з ціснёнымі залатымі гішпанскімі цюльпанамі, а таксама гербамі і эмблемамі дому Габсбургаў.

Маленькі карлік здзіўлена глядзеў навокал і трохі баяўся ісці далей. Дзіўныя маўклівыя коннікі, што бясшумна імчалі галопам праз доўгія прасекі, здаваліся яму жудаснымі прывідамі, пра якіх ён чуў ад вугальшчыкаў, — начнымі лаўцамі кампрачыкос, якія кожнага сустрэчнага ператвараюць у аленя і потым цкуюць. Але думка пра мілую інфанту вярнула яму мужнасць. Яму хацелася заспець яе адну і



сказаць, што ён таксама яе кахае. Магчыма, яна ў суседнім пакоі.

Ён прабег па мяккіх маўрытанскіх дыванах і адчыніў наступныя дзверы. Не! Там яе таксама не было. Пакой быў пусты.

Гэта была тронная зала, дзе прымалі замежных паслоў, калі кароль — апошнім часам гэта здаралася не часта — пагаджаўся даць ім аўдыенцыю, тая самая зала, у якой шмат гадоў таму з'явіліся ангельскія пасланцы, што прыехалі сватаць сваю каралеву, тады адну з каталіцкіх уладарак Еўропы, са старэйшым сынам імператара. Сцены залы былі задрапіраваныя пазалочанай кордаўскай скурай, а з чорна-белай столі звісала цяжкая пазалочаная люстра на трыста свечак. Пад вялікім балдахінам з залатой парчы, на якой дробным жэмчугам былі вышытыя львы і вежы Кастыліі, стаяў сам трон, пакрыты раскошным пакрывалам з чорнага аксаміту, усыпанага срэбнымі цюльпанамі і па-мастацку аздобленага па краях серабром і жэмчугам. На другой прыступцы трона стаяла лавачка інфанты са срэбнай парчовай падушкай, а яшчэ трошкі ніжэй, ужо не пад балдахінам, месцілася крэсла для папскага нунцыя, адзінага, хто меў права сядзець у прысутнасці караля падчас любой публічнай цырымоніі. Кардынальская шапка нунцыя з пераплеценымі пунсовымі кутасікамі ляжала на пурпуровым століку перад крэслам. На сцяне насупраць трона visеў партрэт Карла V, апранутага ў паляўнічы касцюм, у поўны рост, з вялікім мастыфам побач, а ў сярэдзіне іншай сцяны размяшчаўся партрэт Філіпа II, які прымае знакі падданства ад Нідэрландаў. Паміж вокнамі стаяла шафа з эбенавага дрэва, інкруставаная слановай косткай і ўпрыгожаная разьбой па матывах гальбейнаўскіх «Скокаў смерці», якую, кажуць, сам знакаміты майстар і рабіў.

Але карліка ўся гэтая раскоша не цікавіла. Ён не аддаў бы сваю ружу за ўсе перліны балдахіну, і нават ніводнага яе белага пялёстка за ўвесь трон. Ён хацеў усяго толькі ўбачыць інфанту да таго, як яна спусціцца ў павільён, і папрасіць яе сысці разам з ім, калі ён скончыць танчыць. Тут, у палацы, паветра спёртае і цяжкое, а ў лесе дзьме свежы вецер і сонечнае святло перабірае неспакойнымі залатымі пальцамі дрыготкае лісце. Там, у лесе, ёсць кветкі, можа, не такія шыкоўныя, як у садзе, але з нашмат саладзейшым водарам: ранні вясной — гіяцынты, што хвалістым пурпурам заліваюць прахалодныя лагчыны і пароснія травой пагоркі, жоўтыя прымулы, што невялічкімі чародкамі туляцца вакол вузлаватых каранёў дубоў, яркі чыстацел, і блакітны крынічнік, і касачы, бэзавыя і залацістыя. Там шэрыя каташкі на арэшніку, і наперстаўка хіліцца пад цяжарам стракатых, аблепленых пчоламі чашачак. Свечкі каштанаў усыпаныя белымі зорамі, а глог пакрыты прыўкраснымі беднымі поўнямі. Так, яна, безумоўна, пойдзе з ім, калі ён толькі яе знойдзе! Яна пойдзе з ім у чароўны лес, і ён цэлы дзень будзе танчыць дзеля яе асалоды. Ад гэтай думкі ў яго вачах загарэлася ўсмешка, і ён рушыў у наступны пакой.

Гэты пакой быў самым яркім і прыгожым. Сцены былі абцягнутыя ружовай лукскай адамашкай, упрыгожанай птушкамі і вытанчанымі срэбнымі кветкамі, мэбля была з адлівнага серабра, аздобленая фестонамі ў выглядзе раскошных гірляндаў і вясёлымі купідонамі, перад двума вялікімі камінамі стаялі шырокія шырмы, расшытыя папугаямі і паўлінамі, а падлога з бірузовага оніксу, здавалася, знікала дзесьці ўдалечыні. Але карлік быў тут не адзін. На аддаленым баку пакоя ў цені дзвярнога праёма стаяла нейкая фігура і глядзела на яго. Сэрца яго забілася, з вуснаў сарваўся радасны крык, і ён выйшаў на святло. І калі ён гэта зрабіў, фігура таксама зрабіла крок наперад, і цяпер яе можна было разгледзець.

Інфанта? Не, гэта была пачвара, самая бязглуздая пачвара, якую ён толькі бачыў! Звыродліва складзеная, не так, як іншыя людзі, гарбатая пачвара з крывымі нагамі і рукамі, з вялізнай галавой, што матлялася з боку ў бок, і з грывай чорных валасоў. Маленькі карлік нахмурыўся, і пачвара нахмурылася таксама. Ён засмяяўся — і яна засмяялася разам з ім, ён узяўся за бакі — і яна паўтарыла яго рух. Ён насмешліва пакланіўся — і пачвара вярнула яму паклон. Ён зрабіў крок да яе — і яна пайшла насустрач, пераймаючы кожны яго жэст і спыняючыся тады ж, калі спыняўся ён. Ён ускрыкнуў ад здзіўлення і пабег да яе, выцягнуўшы руку, і кранууўся рукі пачвары, і яна была халодная, як лёд. Спалохаўшыся, ён павёў рукой убок, і пачвара тут жа паўтарыла за ім. Ён паспрабаваў адціснуць яе, але наткнуўся на нешта цвёрдае і гладкае. Твар пачвары быў цяпер зусім побач, і на ім чытаўся жах. Ён паправіў валасы, што падалі на вочы. Пачвара таксама. Ён ударыў яе, і яна адказала ўдарам на ўдар. Ён скурчыў гідлівую грымасу — і яна таксама пачала крыўляцца. Ён падаўся назад — яна таксама адступіла.

Што ж гэта такое? Ён на хвілінку задумаўся і агледзеў рэшту пакоя. Дзіўна: усё, што было тут, нібыта падвойвалася за гэтай нябачнай сцяной чыстай вады. Так-так, тут карціна — і там карціна, тут канапа — і там канапа. Вось у алькове ля дзвярэй спіць фаўн — а вось дрэмле яго брат-блізнюк, а срэбная Венера, што стаіць у сонечным святле, цягне руку да другой Венеры, такой жа прыгожай, як першая.

Можа, гэта рэха? Аднойчы ён загукаў да яго ў даліне, і яно адказала яму, паўтарыла слова за словам. Ці можа яно перадражніваць погляд, як перадражнівае голас? Ці можа яно стварыць штучны свет, не адрозны ад сапраўднага? Ці могуць цені прадметаў мець колер, рухацца і жыць? Ці можа быць, што?..

Ён скалануўся і, узяўшы з грудзей прыгожую белую ружу, павярнуўся і пацалаваў яе. У пачвары была такая самая ружа, пялёстак да пялёстка! Пачвара гэтак жа цалавала кветку і звыродлівым рухам прыціскала яе да грудзей!

Калі карлік раптам зразумеў усю праўду, ён з дзікім крыкам адчаю паваліўся на падлогу і зарыдаў. Гэта ж ён сам такі брыдкі і гарбаты, паскудны з выгляду і бязглузды! Ён і ёсць гэтай пачварай, і гэта менавіта з яго смяяліся дзеці, а маленькая прынцэса, якая, думаў ён, яго кахае, — яна таксама проста кпіла з яго агіднасці і забаўлялася, гледзячы на яго крывыя ногі. Чаму яны не пакінулі яго ў лесе, дзе няма люстэрка, якое сказала б яму пра яго брыдоту? Чаму бацька не забіў яго, а прадаў дзеля жудаснай ганьбы? Па яго шчоках цяклі гарачыя слёзы, і ён парваў белую ружу на шматочкі. Распасцёртая на падлозе пачвара зрабіла тое самае і раскідала ў паветры бездапаможныя пялёсткі. Яна поўзала па падлозе, і калі карлік глядзеў на яе, падымала на яго скрыўлены ад болю твар. Карлік адсунуўся далей, каб не бачыць яе, і закрыў вочы рукамі. Як паранены звер, ён схаваўся ў цень і стагнаў там.

У гэты момант у пакой увайшла інфанта са сваёй світай і ўбачыла брыдкага карліка, што ляжаў у куце і скурчанымі рукамі біў у падлогу так вычварна і бязглузда, што дзеці тут жа весела зарагаталі, абступілі карліка і не зводзілі з яго вачэй.

— Ён так смешна танчыў, — сказала інфанта, — але гэты спектакль яшчэ лепшы. Ён амаль такі ж добры, як марыянеткі, хіба што не такі натуральны.

Яна замахала вялікім веерам і запляскала.

Але маленькі карлік нават не зірнуў на яе, яго ўсхліпы рабіліся ўсё слабейшымі і слабейшымі, і раптам ён сутаргава глынуў паветра і схапіўся за бок. Потым паваліўся зноў і больш не варушыўся.

— Гэта было шыкоўна, — праз некаторы час сказала інфанта, — але цяпер ты мусіш для мяне патанчыць.

— Так! — закрычалі астатнія дзеці. — Ты мусіш падняцца і патанчыць, ты такі ж разумны, як варварыйскія малпы, нават яшчэ больш смешны.

Але маленькі карлік не адгукнуўся.

Тады інфанта тупнула нагой і паклікала дзядзьку, які прагульваўся па тэрасе з камергерам, чытаючы лісты, якія толькі што прыбылі з Мексіка, дзе акурат заснавалі святую інквізіцыю.

— Мой мілы маленькі карузлік у кепскім настроі, — усклікнула яна, — ты мусіш падняць яго і сказаць, каб ён патанчыў.

Усміхнуўшыся адно аднаму, яны ўвайшлі ў пакой і марудна падплылі да карліка. Дон Педра нахіліўся над яго целам і паляпаў карліка па шчоках вышытай пальчаткай.

— Давай патанчы, petit monstre, — прамовіў ён. — Давай патанчы. Інфанта гішпанская і індыйская хоча, каб яе забавілі.

Але маленькі карлік не варухнуўся.

— Трэба паслаць па бізун, — стомлена сказаў дон Педра і зноў выйшаў на тэрасу. Але камергер змрочна апусціўся побач з карлікам і паклаў руку яму на сэрца. Праз некалькі імгненняў ён паціснуў плячыма, падняўся і, нізка пакланіўшыся інфанце, сказаў:

— Mi bella Princesa, ваш мілы маленькі карузлік больш ніколі не затанчыць. Шкада: ён такі брыдкі, што мог бы рассмяшыць нават караля.

— Але чаму ён больш ніколі не затанчыць? — са смехам спытала інфанта.

— Бо ў яго разбілася сэрца, — адказаў камергер.

Інфанта нахмурылася, і яе зграбныя, падобныя да ружавых пялёсткаў вусны чароўна скрывіліся ад пагарды.

— Я папрашу, каб надалей у тых, хто прыходзіць са мной гуляць, сэрца не было! — усклікнула яна і пабегла ў сад.

Пераклад з англійскай мовы
Ганны Янкута

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by